М. В. Альфер
А. П. Сафонава

# Беларуская мова 3

Частка 2



М. В. Альфер
А. П. Сафонава

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 2

*Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, перапрацаванае

Мінск «Народная асвета» 2011

Правообладатель Народная асвета

УДК 811.161.3(075.2=161.3)-056.313
ББК 81.2Беи-922
А59

Рэцэнзенты:

кафедра беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А. Г. Міхалевіч*); настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Навагрудская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення» *Н. М. Гасціла*

## Умоўныя абазначэнні:

 дамашняе заданне

правіла

 развіццё звязнага маўлення

 пытанні і заданні

 слоўнік

спрошчанае заданне

абавязковае заданне

заданне павышанай складанасці

 вучыцеся гаварыць хутка

 вучыцеся весці размову

**Альфер, М. В.**

А59 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. спец. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / М. В. Альфер, А. П. Сафонава. — 2-е выд., перапрац. — Мінск : Нар. асвета, 2011. — 135 с. : іл.

ISBN 978-985-03-1504-5.

Вучэбны дапаможнік для 3-га класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання.

**УДК 811.161.3(075.2=161.3)-056.313**
**ББК 81.2Беи-922**

**ISBN 978-985-03-1504-5 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-03-1505-2**

© Альфер М. В., Сафонава А. П., 2000
© Альфер М. В., Сафонава А. П., 2011, са змяненнямі
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2011

Правообладатель Народная асвета

# ЧАСЦІНЫ МОВЫ

## Назоўнік

**1.** Прачытайце словы. Пастаўце да кожнага пытанне хто? або што? Запішыце словы.

людзі, пшаніца, жыта, аграном, грузавік, жаваранак, камбайн, рабіна, дождж, зубр, пчала, рыба, папугай, сабака

Словы, якія называюць прадметы і адказваюць на пытанні хто? або што?, называюцца **назоўнікамі:** *дзед* (хто?), *яблык* (што?).

**2.** Прачытайце словы. Пастаўце да іх пытанні.

тэхнік — тэхнічка, цялятнік — цялятніца, пілот — пілотка, майстар — майстэрня

Запішыце спачатку словы, якія адказваюць на пытанне хто?, а потым словы, якія адказваюць на пытанне што? Растлумачце сэнс гэтых слоў. Пры неабходнасці звярніцеся да тлумачальнага слоўніка.

Назоўнікі, якія называюць людзей, жывёл, птушак і іншых жывых істот, адказваюць на пытанне хто?: *вучань, трактарыст, жаваранак*. Назоўнікі, якія называюць з'явы прыроды, машыны, расліны і іншыя прадметы, адказваюць на пытанне што?: *завод, кніга, яблыня.*



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце. Дапішыце назвы прадметаў па ўзоры.

***Людзі*** (хто?): *вучань, ...*
***Звяры*** (хто?): *зубр, ...*
***Ягады*** (што?): *журавіны, ...*
***Мэбля*** (што?): *шафа, ...*

Словы для выкарыстання знайдзіце ў слоўніку.

**журавí́ны** **жа́варанак** **піво́ня** **вяргí́ня**

**4.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх. Запішыце адказы.

Хто паляцеў у вырай?
Хто ўсю зіму спіць?
Што расце на агародзе?
Што расце ў садзе?

**5.** Прачытайце верш. Што ў ім пераблытана?

Ліса на бярозе,
а кіт пад кустом.
Вавёрка ў бярлозе
ахоплена сном.

Барсук за сасонкай
сабе звіў дупло,
а лось дзюбай тонкай
зноў чысціць крыло.

*С. Шах.*

Выпішыце словы, якія адказваюць на пытанне хто?

У якіх словах усе зычныя цвёрдыя?


Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце словы. Аб’яднайце іх у групы па ўзоры. Запішыце групы слоў разам з абагульняльным словам. Пастаўце пытанні.

Узор. ***Дрэвы*** (што?) — *бяроза*, **...**, **...** .

бяроза, рамонак, шклянка, аўторак, чацвер, таполя, сподак, вярба, талерка, нядзеля, півоня, збан, серада, вяргіня

**2.** Прачытайце. Пастаўце пытанні да кожнага слова. Да назваў жывёл падбярыце назву ежы. Запішыце словы парамі.

Узор: *сабака — костка*, **...** .

сабака, мядзведзь, малпа, кот, дзік
костка, мёд, бананы, малако, жалуды
У якіх словах усе зычныя цвёрдыя?
У якім слове ўсе зычныя мяккія?

**3.** Прачытайце выразна верш. Выпішыце спачатку назоўнікі, якія адказваюць на пытанне хто?, а потым назоўнікі, якія адказваюць на пытанне што?

Працуе цягнік,
працуе матор,
працуе цясляр,
будаўнік, шахцёр,
працуюць вада,
электрычны ток,
працуе і ўдзень
і ўначы хлебапёк.

*А. Дзержынскі.*

**Пагутарым.** Кім працуюць вашы бацькі? Раскажыце.



Правообладатель Народная асвета

**4.** Складзіце адзін ланцужок з назоўнікаў, якія адказваюць на пытанне хто?, а другі з назоўнікаў, якія адказваюць на пытанне што? Запішыце словы па ўзоры.

Узор. (Хто?) *Чалавек — кот, ..., ..., ... .*
(Што?) *Дуб — барабан, ..., ..., ... .*

**5.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце намаляваныя прадметы і жывых істот.



Запішыце назоўнікі ў два слупкі. У першы — якія адказваюць на пытанне хто? У другі — якія адказваюць на пытанне што?

| Узор: хто? | што? |
|---|---|
| бусел | елка |



Правообладатель Народная асвета

**6.** Прачытайце. Закончыце сказы патрэбным словам. Запішыце сказы. Вусна пастаўце да ўстаўленых слоў пытанні.

Дзеці пайшлі на школьны .

Лоўка скокнуў на лаўку маленькі .

У лесе выраслі вялікія .

З норкі выбеглі рыжыя .

| | | |
|---|---|---|
| **лісíчка** | **край** | **Радзíма** |
| **лісíчкі** | **Айчы́на** | **Бáцькаўшчына** |

3

## Напісанне назоўнікаў з вялікай літары

**1.** Прачытайце верш **«Твая Беларусь»**.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой,
твой родны край, твая Айчына —
жыццё тваё і гонар твой.

І ты яе запомні імя,
як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
названа светла — Бе-ла-русь. *Ю. Свірка.*

Выпішыце словы, якія напісаны з вялікай літары. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца?



Правообладатель Народная асвета

Словы, якія называюць краіны, гарады, вёскі, рэкі, моры, азёры, вуліцы, пішуцца з вялікай літары: *Расія, горад Мінск, вёска Чаромушкі, рака Вілія, Чорнае мора, возера Нарач.*

Словы *Айчына, Радзіма, Бацькаўшчына* таксама пішуцца з вялікай літары, калі яны ўжываюцца ў значэнні *Беларусь*.

**2.** Прачытайце верш.

**Беларусь**

Тут Дняпро бяжыць прывольна,
Сож, Бярэзіна, Дзвіна,
Прыпяць, Шчара, Свіслач, Нёман,
Вілля, Піна, Буг, Дзісна.
Тут крыштальныя азёры —
Нарач, Свіцязь, Снуды, Свір.
Полацк — наш найпершы горад,
Віцебск, Тураў, Кобрын, Мір.

*М. Пазнякоў.*

Выпішыце спачатку назвы беларускіх рэк, потым азёр, а потым — гарадоў. Падкрэсліце ў гэтых назвах вялікую літару.

Узор. ***Рэкі***: *Дняпро*, ..., ... .
***Азёры***: *Нарач*, ..., ... .
***Гарады***: *Полацк*, ..., ... .

**Сож** **Сві́слач** **Дняпро́** **Бярэзі́на**



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце.

(*р*, *Р*) .ака (*в*, *В*) .ёска (*г*, *Г*) .орад (*в*, *В*) .озера

(*с*, *С*) .віслач (*к*, *К*) .уранец, (*в*, *В*) .ілейка (*н*, *Н*) .арач

Запішыце, раскрываючы дужкі. Выберыце вялікую або малую літару.

**4.** Прачытайце. Устаўце патрэбныя словы. Запішыце. Падкрэсліце вялікую літару.

Сталіца Беларусі — горад … . Праз увесь горад цячэ рака … . У Мінску ёсць … возера. На ўскраіне горада знаходзіцца … мора. Жыхары сталіцы карыстаюцца вадой з … вадасховішча.

Выкарыстайце словы: *Мінск*, *Свіслач*, *Камсамольскае*, *Мінскае*, *Вілейскага*.



**Пагутарым.** Ці былі вы ў Мінску? Што бачылі?



**5.** Прачытайце словы. Падбярыце адпаведныя назвы. Карыстайцеся слоўнікам.

*горад Нясвіж* рака … вёска …

сталіца … возера … мора …

Запішыце. Падкрэсліце вялікую літару.



**Нясві́ж** **Вя́зынка** **Сві́цязь** **Пры́пяць**



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце. Выпішыце імёны і прозвішчы людзей. Падкрэсліце вялікую літару.

Францыск Скарына — беларускі першадрукар.

Кастусь Каліноўскі — змагар за незалежнасць нашай зямлі.

Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак — беларускія касманаўты.

Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка — першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**касмана́ўт** **прэзідэ́нт** **першадрука́р**

Імёны, імёны па бацьку і прозвішчы людзей пішуцца з вялікай літары: *Ніл Сямёнавіч Гілевіч.*

**2.** Прачытайце верш «**Не скважная**».

Я цукеркі несла ў школу,
папрасіў адну Мікола,
за Міколкам — Каралінка,
а за ёю — Стась, Янінка,
і яшчэ падбегла Міла:
— Мне цукеркі не хапіла!
— На, апошнюю, трымай,
я не скважная, ты знай! *Г. Кляшторная.*

Выпішыце імёны дзяцей. Падкрэсліце вялікую літару. Растлумачце сэнс слова *скважная.*



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце імёны.

Стась, Станіслаў, Алена, Яўген, Света, Рома, Паўлік, Надзя, Лена, Раман, Гена, Таня, Жэня, Павел, Надзея, Генадзь, Таццяна, Святлана

- Спішыце. Падкрэсліце вялікую літару.
- Запішыце словы парамі па узоры. Падкрэсліце вялікую літару.

Узор: *Света — Святлана.*

- Запішыце імёны сваіх родных па папярэднім узоры.

**4.** Прачытайце. Устаўце вялікую літару. Запішыце.

***Жаночыя імёны***: .анна, .аццяна, .арына, .ар’я, .ар’я, .ацярына, .ольга.

***Мужчынскія імёны***: .ван, .ляксандр, .ляксей, .ікола, .нка, .яргей, .аўлік.

***Імёны пісьменнікаў***: .ыгор .арадулін, .асіль .ітка, .куб .олас, .нка .упала, .іхась .ынькоў, .яргей .рахоўскі.



**5.** Прачытайце. Дапоўніце сказы ўласнымі імёнамі. Запішыце сказы.

Мяне завуць ... . Маё імя па бацьку ... . Маё прозвішча ... . Майго тату завуць ... . Маю маму завуць ... . У мяне ёсць сястрычка ... і брацік ... .

Падкрэсліце вялікую літару ва ўласных імёнах.



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце пачатак казкі. Раскажыце яе да канца.

Жылі ў адным двары курачка Раба, гусак Шыпун і індык Балбатун.

Спішыце. Падкрэсліце вялікую літару ў клічках птушак. Якія клічкі бываюць у свойскіх птушак?

Клічкі жывёл пішуцца з вялікай літары: *сабака **Ш**арык, конь **Б**уран, карова **Л**ыска.*

**2.** Разгледзьце малюнак. Назавіце жывёл, якія ёсць у гаспадарцы. Прыдумайце ім клічкі. Запішыце па ўзоры.





Правообладатель Народная асвета

Падкрэсліце вялікую літару ў клічках жывёл.

*карова Лысуха* сабака ...
кот ... певень ...
конь ... каза ...

Якія клічкі ў вашых свойскіх жывёл?

**3.** Прачытайце. Складзіце сказы. Запішыце. Падкрэсліце вялікую літару ў клічках жывёл.

Кастусь, жывёл, і, любіць, птушак.
Кацяня, ёсць, у, яго, Цішка.
Дружок, сабака, у, будцы, жыве.
Спіць, Яська, шпак, шафе, на.
Куток, вожык, займае, на, Тупцік, кухні.
У, сябры, цікавыя, Кастуся.



**Пагутарым.** А вы маеце такіх сяброў? Раскажыце.

**4.** Прачытайце. Выпраўце памылкі.

Васілёк пісаў дамашняе заданне:
сабака белячок, карова ночка, кошка мурка, каза мушка, папугай гоша, пеўнік крыкун, курачка хахлатка

Запішыце дамашняе заданне Васілька правільна. Падкрэсліце вялікія літары ў клічках жывёл.



**5.** Прачытайце.

(*с*, *С*) абака (*т*, *Т*) узік
(*к*, *К*) арова (*к*, *К*) расуля



Правообладатель Народная асвета

(*к*, *К*) онь (*б*, *Б*) уланы
(*к*, *К*) аза (*з*, *З*) орачка

Спішыце, выбіраючы вялікую або малую літару.

## Род назоўнікаў

6

**1.** Прачытайце верш. Спішыце.

Той, хто быць пісьменным хоча,
знаць павінен з першых год
род мужчынскі, род жаночы
і яшчэ — ніякі род. *А. Вольскі.*

Які род называе паэт? Да слова *род* падбярыце аднакаранёвыя словы.

Назоўнікі, да якіх можна падставіць словы *ён, мой,* адносяцца да **мужчынскага роду:** *трактар, дом, сын, настаўнік, звер.* Назоўнікі, да якіх можна падставіць словы *яна, мая,* адносяцца **да жаночага роду:** *зямля, мама, школа, Радзіма, ягада, зіма.* Назоўнікі, да якіх можна падставіць словы *яно, маё,* адносяцца **да ніякага роду:** *дзіця, кацяня, возера, гняздо, сонца.*

**2.** Прачытайце словы. Вызначце род назоўнікаў, выкарыстоўваючы дапаможныя словы.

аб'ява, Беларусь, беларус, білет, вецер, збожжа, разводдзе, мора, карабель, крэсла, сцяна,



Правообладатель Народная асвета

гняздо, вада, жыта, хлеб, зямля, зорка, планета, каляндар, камп’ютар, жыццё

Запішыце словы ў тры слупкі.

| | | |
|---|---|---|
| Узор: ён, мой | яна, мая | яно, маё |
| *беларус* | *Беларусь* | *збожжа* |

**3.** Прачытайце. Змяніце назоўнікі па ўзоры.

Узор: *школьнік* (***м. р.***) — *школьніца* (***ж. р.***)

вучань —
настаўнік —
сябар —

Запішыце пары слоў, вызначце род.
Колькі гукаў і колькі літар у слове *вучань?*

**4.** Прачытайце словы. Вызначце іх род.

вуліца, метро, асфальт, аўтамабіль, святлафор, пешаход, шафёр, шафа, крэсла, канапа, стол, зэдлік

- Запішыце словы па ўзоры.

  Узор: *вуліца* (***ж. р.***), *метро* (***н. р.***), *асфальт* (***м. р.***)

- Аб’яднайце словы ў групы і запішыце.
- Складзіце сказы са словамі, якія адносяцца да групы ***мэбля***.



**зэ́длік** **атэлье́** **кана́па**



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце словы. Вызначце іх род. Запішыце.

Узор: *вагон* (***м. р.***).

вагон, рамонак, запіска, вакзал, атэлье, елка, ельнік, свет, світанне

## 7

**1.** Прачытайце верш.

Бусел гняздо
на старым дубе ладзіць.
Тупае чапля,
ідзе ў сітнякі.
На астравок асцярожна вылазіць
чуткі бабёр з каламутнай вады.

*А. Дзеружынскі.*

Выпішыце спачатку назоўнікі, якія адказваюць на пытанне хто?, а потым — на пытанне што? Вызначце іх род.

Узор: (хто?) *бусел* (***м. р.***);
(што?) *гняздо* (***н. р.***).

**2.** Да кожнага назоўніка падбярыце супрацьлеглыя па сэнсе словы. Вызначце іх род. Запішыце па ўзоры.

Узор: *холад* (***м. р.***) — *цяпло* (***н. р.***).

дзень — шум —
раніца — лета —



Правообладатель Народная асвета

**3.** Да кожнага назоўніка падбярыце блізкія па значэнні словы. Вызначце іх род. Запішыце словы па ўзоры.

Узор: *нашчадак* (***м. р.***) — *патомак* (***м. р.***).

| | |
|---|---|
| зеляніна — | лодка — |
| злосць — | сажалка — |
| падарунак — | суп — |
| нашчадак — | смоўж — |

Выкарыстайце словы: *зелень, копанка, гнеў, слімак, човен, поліўка, гасцінец, патомак.*

Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слоў *нашчадак, патомак*.

**нашча́дак** **пато́мак** **гасці́нец**

**4.** Прачытайце верш. Спішыце. Вызначце род выдзеленых назоўнікаў.

**Лёд** на лужах, як люстра, ззяе,
і **сонца** зрэдку ў ім гуляе. *Якуб Колас.*

**5.** Запішыце назоўнікі на тэму «***Зіма***». Вызначце іх род.

**8**

**1.** Прачытайце словы. Складзіце са слоў сказы. Разгледзьце малюнак. Раскажыце, што вы на ім бачыце.

Вечарам, Аленка, Петрык, кот Пушок, і, і, сабака Шарык, справамі, займаюцца, сваімі.



Правообладатель Народная асвета

Шарык, па, мультфільм, тэлевізары, глядзіць.
Петрык, з, майструе, дамы, канструктара.
Аленка, лялек, шые, для, сукенкі.
Пушок, з, гуляе, катушкамі, нітак.

Складзіце са сказаў тэкст. Выкарыстайце малюнак. Прыдумайце загаловак. Запішыце тэкст.



Выпішыце з тэксту назоўнікі. Пастаўце да іх пытанні. Абазначце род назоўнікаў па ў з о р ы.

У з о р: дом (***м. р.***).



Правообладатель Народная асвета

# Лік назоўнікаў

9

**1.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце намаляваныя прадметы.



Запішыце назвы прадметаў па ўзоры.

Узор: *гарбуз — гарбузы.*

? Што называе кожнае слова?
У якія групы можна аб'яднаць гэтыя словы?
Вызначце канчаткі назоўнікаў множнага ліку.

Назоўнікі змяняюцца па ліках. Яны могуць ужывацца ў **адзіночным** ліку (*сшытак, ручка, акно*) і ў **множным** (*сшыткі, ручкі, вокны*). Назоўнік у адзіночным ліку абазначае адзін прадмет, у множным ліку — два або некалькі прадметаў.



Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце вершы *Якуба Коласа*. Вызначце лік назоўнікаў.

Марозік крэпіць, лёд таўшчэе,
і рэчка вольная нямее.
Да дна вадзіца вымярзае
і ходу бедная не мае.

Надышлі маро́зы,
рэчкі закавалі,
белыя бярозы
шэранем убралі.

Выпішыце назоўнікі ў два слупкі па ўзоры.

Узор: ***адз. л.*** ***мн. л.***
*марозік* *марозікі*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **лёд** | **бяро́за** | **маро́з** | **хо́лад** |
| **ільды́** | **бяро́зы** | **маразы́** | **халады́** |

**3.** Прачытайце.

бор, стол, дом, двор, горад, холад, рака, гара, сасна, пчала

- Запішыце словы. Вызначце род назоўнікаў.
- Пастаўце назоўнікі ў множным ліку. Запішыце.
- Запішыце некалькі назоўнікаў у множным ліку на тэму ***«Вучнёўскія прылады»***.

**4.** Прачытайце. Пастаўце назоўнікі ў адзіночным ліку і запішыце. Абазначце род.



Правообладатель Народная асвета

У з о р: *колас* (*м. р.*), *песня* (*ж. р.*).

каласы, дажджы, білеты, заводы, гаражы, арэхі, рэкі, птушкі, палі, песні, зоркі

**5.** Запішыце назвы сваіх любімых цацак. Пастаўце назоўнікі ў множным ліку.

У з о р: *машына — машыны.*

**Пагутарым.** Якая цацка вам больш за ўсё падабаецца? Чаму?

## 10

**1.** Прачытайце сказы. Вызначце лік назоўнікаў.

Заснежаная сасна стаіць у белай масцы.

Заснежаныя сосны стаяць у белых масках.

Там спяць, як у пярыне, глушэц і курапатка.

Там спяць, як у пярынах, глушцы і курапаткі.

Выпішыце назоўнікі. Абазначце іх лік. Звярніце ўвагу, як змяняюцца іншыя словы ў сказе ў залежнасці ад ліку назоўніка.

> Каб вызначыць род назоўніка, які стаіць у множным ліку, трэба паставіць яго ў адзіночным ліку і падабраць да яго словы *ён, мой, яна, мая, яно, маё.*



Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце верш «**Снегіры**». Вызначце род і лік назоўнікаў.

Як агеньчыкі, у двары
скачуць, скачуць снегіры.
Запытала ў брата Таня:
— Можа, снег ад іх растане? *П. Пранузa.*

- Спішыце. Падкрэсліце аданакаранёвыя словы. Абазначце іх лік.
- Спішыце. Абазначце род і лік назоўнікаў.
- Запішыце 2-3 сказы пра снегіра. Вызначце род і лік назоўнікаў.

**3.** Прачытайце. Адкажыце на пытанні адным словам. Запішыце. Вызначце род і лік назоўнікаў.

Якая пара года наступіць пасля восені?
Што пакрые зямлю?
Што з'явіцца на рэках і азёрах?
Што падрыхтуюць дзеці да зімы?

**Пагутарым.** Якая пара года вам падабаецца? Чаму? Раскажыце сваім сябрам.

**4.** Прачытайце тэкст. Замяніце назоўнікі адзіночнага ліку на назоўнікі множнага ліку.

Мароз малюе на акне дзівосны ўзор. У акне ззяе вясёлы агеньчык. Ад ветру хістаецца дрэва. Мяцеліца замятае дарогу.

Запішыце новы тэкст. Абазначце лік назоўнікаў.


Правообладатель Народная асвета

**5.** Утварыце назоўнікі па ў з о р ы. Запішыце словы парамі. Вызначце іх род і лік.

У з о р: *стол — сталяр.*

| | | |
|---|---|---|
| лес — ... | школа — ... | лыжы — ... |
| грыбы — ... | музыка — ... | пчолы — ... |

**11**

**1.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні.



Куды сабраліся дзеці?
Што яны ўзялі з сабою?
Чым яны будуць займацца?



Правообладатель Народная асвета

Дайце імёны дзецям. Запішыце сказы, каб атрымаўся тэкст. Падкрэсліце назоўнікі. Вызначце іх род і лік.

Выкарыстайце словы і словазлучэнні: *вырашылі адпачыць, мяч, вядро для рыбы, вудачка, кошык для грыбоў, бадмінтон.*

**2.** Прачытайце. Знайдзіце ў тэксце назоўнікі множнага ліку. Запішыце. Вызначце род назоўнікаў множнага ліку.

## На беразе возера

На паўднёвым беразе возера расце сасновы лес. Унізе сцелецца верас. А над верасам гамоняць шумлівыя сосны.

Возера маўчыць. На пясок павольна набягаюць хвалі. Чайкі лётаюць над люстраной вадой (*паводле Я. Брыля*).

## *Што мы ведаем?*

**1.** Што такое назоўнік? Прывядзіце прыклады назоўнікаў.

**2.** Чаму адны назоўнікі адказваюць на пытанне хто?, а другія — на пытанне што?

**3.** Якія назоўнікі пішуцца з вялікай літары?

**4.** Якога роду бываюць назоўнікі?

**5.** Якога ліку бываюць назоўнікі?

**6.** Назавіце ўсе прадметы, якія ёсць у класе. Вызначце іх род і лік.



Правообладатель Народная асвета

# Прыметнік

**1.** Прачытайце верш *С. Шушкевіча*. Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы. Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слова *шалёны*.

Белымі сняжынкамі
ўся дарожка ўсеяна.
Была ў полі рэчанька,
ды не стала. Дзе яна?

Была ў полі елачка,
пышная, зялёная.
А яе мяцеліца
замяла шалёная.

Якімі сняжынкамі ўсеяна дарожка?
Якая была елачка? Якая мяцеліца?

**Пагутарым.** Раскажыце, якое бывае надвор'е зімой.

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?, называюцца **прыметнікамі.**

**2.** Прачытайце тэксты. Параўнайце іх. Выпішыце словазлучэнні па ўзоры.

Узор: *дрэва* (якое?) *магутнае і велічнае.*

**I.** Дуб — дрэва. Ён мае ствол, крону. На яго галінах растуць лісты.

**II.** Дуб — магутнае і велічнае дрэва. Ён мае моцны і высокі ствол, густую крону. На яго тоўстых галінах растуць прыгожыя зялёныя лісты.

Які тэкст больш цікавы і прыгожы?
Якія словы дапамаглі стварыць такое апісанне?


Правообладатель Народная асвета

У сказе прыметнікі звязаны з назоўнікамі. *На елцы сядзела прыгожая вялікая птушка. Птушка* (я к а я?) *прыгожая, вялікая.* Тэкст можа існаваць без прыметнікаў, але з прыметнікамі ён — больш дакладны і выразны.

**3.** Прачытайце. Аб чым тут гаворыцца? Якім словам закончыўся сказ? Запішыце сказ. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.

Марозная, калючая, снежная, скрыпучая, прыйшла да нас сама халодная з... .

**4.** Па прыметах назавіце прадметы. Запішыце.

Злосная, калючая, шалёная ... .
Халодны, моцны, паўночны ... .
Цёмнае, шэрае, нізкае ... .
Глыбокія, белыя, іскрыстыя ... .

В ы к а р ы с т а й ц е   с л о в ы: *снягі, неба, вецер, мяцеліца.*



**5.** Прачытайце верш. Пастаўце пытанні да прыметнікаў. Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.

Нос чарнявы,
хвост бялявы,
задзірасценькі.
Кіпцік-шчыпчык
заграбасценькі.

Лапкі-драпкі
машастовыя,
а шарсціначкі
шаўковыя.

*Якуб Колас.*



Правообладатель Народная асвета

## 13

**1.** Прачытайце.

**Цёплы дзень, зялёная трава, яркае сонца.**
**Ранні ячмень, летняя раніца, жытнёвае поле.**
**Трактарны завод, мэблевая фабрыка, машыннае масла.**

- Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.
- Запішыце словазлучэнні па ўзоры:

*дзень* (які?) *цёплы*, *трава* (якая?) *зялёная*, *сонца* (якое?) *яркае*.

- Складзіце і запішыце 2-3 сказы са словазлучэннямі (*на выбар*).



**2.** Прачытайце загадку. Адгадайце яе.

**Чырвонае цельца, каменнае сэрца,**
**салодкая на смак, а завецца як?**

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй. Пастаўце да іх пытанні.

**ві́шня** **я́блычны** **зімаро́дак** **ільны́**

**3.** Прачытайце прыметнікі. Падбярыце да іх супрацьлеглыя па сэнсе словы.

| | |
|---|---|
| гарачы — ... | вясёлы — ... |
| горкі — ... | здаровы — ... |
| жвавы — ... | карысны — ... |
| сухі — ... | радасны — ... |



Правообладатель Народная асвета

Запішыце словы парамі. Вусна складзіце 2-3 сказы.

Выкарыстайце словы: *марудлівы, салодкі, халодны, хворы, сумны, шкодны, мокры, журботны.*

**4.** Прачытайце. Утварыце прыметнікі ад назоўнікаў. Запішыце словазлучэнні. Пастаўце пытанні ад назоўніка да прыметніка.

Узор: *песня* (якая?) *радасная.*

Песня (*радасць*). Занятак (*цікавасць*). Надвор’е (*мароз*). Мультфільм (*смех*). Звер (*лес*). Дзень (*зіма*). Пірог (*яблык*).



**5.** Прачытайце сказы.

Мяккі снег лятае пухам (*Якуб Колас*). Лес сівы стаіць сцяною (*Н. Гілевіч*). Белым снегам замятае вецер чорныя палі (*Якуб Колас*). Заснулі белыя палеткі (*А. Вялюгін*).

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй. Пастаўце да іх пытанні.

## 14

**1.** Прачытайце тэкст. Пастаўце пытанні да прыметнікаў. Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі.

### Зімародак

Гэта невялічкая дзіўная птушка. Галоўка і шырокія крылы ў яе сінія, спінка і хвосцік бла-



Правообладатель Народная асвета

кітныя з зялёным адлівам, а тулава рыжае. Зімародак — выдатны рыбалоў. Таму і селяцца гэтыя птушкі каля бруістых рэк з абрывістымі берагамі (*паводле В. Вольскага*).

**Пагутарым.** Якім бы вы намалявалі зімародка?

**2.** Утварыце прыметнікі ад выдзеленых назоўнікаў. Запішыце словазлучэнні па ўзоры.

Узор: *ваза* (якая?) *шкляная.*

ваза са **шкла**, лялька з **дрэва**, сумка са **скуры**, абрус з **ільну**, цвік з **жалеза**, ручка з **пластмасы**, падушка з **пуху**

**3.** Прачытайце прыметнікі. Падбярыце да іх блізкія па значэнні словы. Запішыце словы парамі.

моцны — ...
заняты — ...
слізкі — ...
пахучы — ...
страшны — ...
цвёрды — ...

Выкарыстайце словы: *скамянелы, духмяны, загружаны, магутны, жахлівы, коўзкі.*

Вусна складзіце 2-3 сказы.

**4.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

*Птушка малая, а карысць ад яе вялікая.*
*Горкая часам праца, ды хлеб ад яе салодкі.*
*У дзіравым вядры не носяць вады.*

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце. Устаўце прапушчаныя прыметнікі па ўзоры. Запішыце.

Узор: *мяккая пасцель — мяккі чалавек*.

| | |
|---|---|
| мядовы голас — ... | *пернік* |
| жалезны характар — ... | *лапата* |
| цёплая сустрэча — ... | *надвор'е* |
| востры нож — ... | *язык* |

Падкрэсліце прыметнікі, якія ўжыты ў пераносным значэнні.

## Змяненне прыметнікаў па родах 15

**1.** Прачытайце словазлучэнні.

Высокі клён, высокая бяроза, высокае дрэва.

Цікавы выпадак, цікавая казка, цікавае здарэнне.

Прыгожы хлопчык, прыгожая дзяўчынка, прыгожае дзіця.

Вызначце род назоўнікаў. Пастаўце пытанні да прыметнікаў.

Запішыце па ўзоры.

Узор: (які?) *родны край* (***м. р.***), (якая?) *родная вёска* (***ж. р.***), (якое?) *роднае поле* (***н. р.***).

**Пагутарым.** Раскажыце пра цікавае здарэнне са свайго жыцця.



Правообладатель Народная асвета

Прыметнікі ў адзіночным ліку змяняюцца па родах.

Прыметнік мае той самы род, што і назоўнік, да якога ён адносіцца.

**2.** Да назоўнікаў падбярыце адпаведныя прыметнікі. Вызначце іх род. Запішыце. Абазначце канчаткі ў прыметніках.

| | |
|---|---|
| зіма | *стракаты, прыгожы, добры* |
| гняздо | *лютая, злосная, доўгая* |
| дзяцел | *утульнае, цёплае, непрыкметнае* |

**3.** Прачытайце табліцу. Параўнайце канчаткі прыметнікаў мужчынскага, жаночага і ніякага роду.

| мужчынскі род<br>які? | жаночы род<br>якая? | ніякі род<br>якое? |
|---|---|---|
| звонкі | звонкая | звонкае |
| роўны | роўная | роўнае |
| нізкі | нізкая | нізкае |
| сіні | сіняя | сіняе |
| сухі | сухая | сухое |

**4.** Прачытайце верш. Пастаўце пытанні да прыметнікаў. Назавіце іх канчаткі і род. Спішыце.

Неба чыстае і глыбокае
і бярозавы ціхі гай —



Правообладатель Народная асвета

Беларусь мая сінявокая,
Беларусь мая, родны край. *У. Карызна.*

Прыметнікі **мужчынскага** роду адказваюць на пытанне які? Яны маюць канчаткі **-ы, -і:** (які?) *бел**ы**, сін**і** паясок.*

Прыметнікі **жаночага** роду адказваюць на пытанне якая? Яны маюць канчаткі **-ая, -яя:** (якая?) *бел**ая**, сін**яя** стужка.*

Прыметнікі **ніякага** роду адказваюць на пытанне якое? Яны маюць канчаткі **-ое, -ае, -яе:** (якое?) *бел**ае**, сін**яе**, залат**ое** поле.*

**5.** Прачытайце словазлучэнні. Дапішыце канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх род.

Зімн. дзень, зімн.. ноч, зімн.. неба.

Радасн. голас, радасн.. вестка, радасн.. паведамленне.

Школьн. ранец, школьн.. форма, школьн.. адзенне.

Спішыце. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

## 16

**1.** Прачытайце групы слоў. Вылучыце чацвёртае «*лішняе*» слова ў кожнай групе. Назавіце абагульняльныя словы.

чырвоны, шаўковы, зялёны, блакітны
смачны, салёны, кіслы, шкляны



Правообладатель Народная асвета

храбры, баязлівы, вузкі, хітры
круглы, белы, авальны, трохвугольны

Запішыце групы прыметнікаў разам з абагульняльным словам.

Узор: *храбры, баязлівы, хітры — якасць.*

**2.** Прачытайце выразна загадку. Адкажыце на пытанне. Запішыце адказ па ўзоры. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

Урадзіўся ён высокі,
шаўкавісты, сінявокі.
Апранае нас здавён.
Здагадайцеся, хто ён?

*У. Мацвеенка.*

Узор: *лён* (які?) ..., ..., ... .



**Пагутарым.** Ці бачылі вы льняное поле ў час цвіцення? Апішыце яго.

**3.** Прачытайце. Ад слоў, што ў дужках, утварыце прыметнікі. Складзіце словазлучэнні. Запішыце.

Узор: *апельсінавы* (**м. р.**) *сок.*

(*апельсін*) сок
(*бульба*) блін
(*банан*) марожанае
(*лімон*) пячэнне
(*грэчка*) каша
(*грыб*) поліўка

Абазначце род прыметнікаў.


Правообладатель Народная асвета

**4.** Прачытайце. Дапоўніце сказы прыметнікамі, якія падыходзяць па сэнсе.

Летам дні звычайна пагодныя, а восенню … .
Рака шырокая, а ручай … .
У сонечны дзень лісце на дрэвах сухое, а пасля дажджу … .
Лістапад — месяц пахмурны, а чэрвень — … .

Запішыце. Падкрэсліце прыметнікі.

**5.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

*Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.*
*Праўда халодная, а мана цёплая.*

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй, абазначце іх род.

## 17

**1.** Прачытайце спалучэнні слоў. Якое значэнне (*прамое ці пераноснае*) маюць у іх прыметнікі?

Лёгкі хлеб, лёгкая сумка, лёгкае воблака.
Звонкі голас, звонкая крыніца, звонкае рэха.
Горкі час, горкая сляза, горкае зелле.

- Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі.
- Выпішыце спалучэнні слоў, якія маюць *прамое* значэнне. Вызначце ў іх род прыметнікаў.
- Складзіце і запішыце сказы са спалучэннямі слоў, якія маюць *пераноснае* значэнне.



Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.



1) У белым сарафане,
пад хусткаю зялёнай
сумуе на паляне
танклявая Алёна.



2) Доўгі чорны Савасцей
ляціць у неба без касцей.



3) Поле белае, няворанае,
зерне дробненькае, чорнае.
Хто ўмее — той пасее,
а хто знае — адгадае.

Спішыце адну з загадак (*на выбар*). Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй, абазначце іх род.

**3.** Прачытайце словазлучэнні. Якое значэнне (*прамое* ці *пераноснае*) маюць у іх прыметнікі?

доўгі хвост, доўгая дарога, доўгае жыццё

Складзіце і запішыце з імі сказы. Абазначце род прыметнікаў.

**4.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце колеры вясёлкі. Запішыце іх. Якія яшчэ колеры вы ведаеце?







Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце. Пастаўце ў дужках пытанні да прыметнікаў. Запішыце па ўзоры.

*Морква* (якая?) *салодкая*; лімон (...?) кіслы, соль (...?) салёная, рэдзька (...?) горкая, трава (...?) зялёная, васількі (...?) сінія, вугаль (...?) чорны, неба (...?) блакітнае, мыш (...?) маленькая, мора (...?) глыбокае, ручай (...?) мелкі.

**18**

**1.** Прачытайце выразна верш *П. Броўкі*.

**Зіма**

Ой, зіма, зіма, зіма!
Весялей цябе няма!
Горка, санкі, гоман, смех.
Сіні вечар, белы снег.
Усе дзеці на каньках.
Колькі радасці ў вачах!



Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй. Абазначце іх род.

**Пагутарым.** У якія гульні можна гуляць зімой?

**2.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак. Устаўце адпаведныя прыметнікі. Запішыце.

За нашай вёскай была ... сажалка.
Зімой дзеці зрабілі ... каток.
Яны расчысцілі ... пляцоўку.



Правообладатель Народная асвета

Для малых змайстравалі ... горку.
І ... мароз ім не страшны.

**3.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.



1) На катку на коней стаў,
хуткай птушкаю памчаў.
І мяне без гэтых коней
аніхто ўжо не дагоніць.
*М. Пазнякоў.*



2) Драўляныя ногі па снезе скачуць,
а ў снег не правальваюцца.

- 🔴 Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.
- 🟡 Выпішыце словазлучэнні назоўнікаў з прыметнікамі. Абазначце іх род і лік.
- 🟢 Якія загадкі пра зіму вы ведаеце? Запішыце адну з іх. Падкрэсліце прыметнікі.

**4.** Прачытайце словы. Прыдумайце прыметы да прадметаў. Пастаўце ў дужках пытанні да прыметнікаў. Запішыце.

Бяроза (...?) ..., ... . Вуліца (...?) ..., ... . Клас (...?) ..., ... . Лес (...?) ..., ... . Неба (...?) ..., ... . Возера (...?) ..., ... .

Выкарыстайце словы: *глыбокае, блакітнае, маўклівы, утульны, шырокая, стройная, зялёная, новая, светлы, густы, хмарнае, ляснoе.*


Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы. Запішыце. Падкрэсліце прыметнікі. Абазначце іх род.

Іскрыцца на зімнім сонцы снег блакітным і ружовым колерам сядзяць на галінках рабіны чырванагрудыя снегіры нібы маленькія ліхтарыкі малюе на вокнах дзівосныя ўзоры мароз-мастак.

**Пагутарым.** Якія ўзоры маляваў мароз на вашых вокнах? Прачытайце ў тэксце.

**19**

**1.** Разгледзьце малюнкі.



Запішыце сказы ў такім парадку, каб атрымалася апавяданне. Прыдумайце загаловак.

Алеся і Святланка зляпілі снегавіка.
На галаву паставілі старое вядро.
Спачатку скаталі вялікі камяк.
А ў рукі далі вялікую мятлу.
Потым меншы. Потым зусім маленькі.
Прыгожы атрымаўся снегавік!



Правообладатель Народная асвета

На вялікі камяк паставілі меншы, а зверху — самы маленькі.

Уставілі вочкі-вугалёчкі і нос-лядзяш.

## Змяненне прыметнікаў па ліках 20

**1.** Прачытайце. Спішыце. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

марозны дзень — марозныя дні
цёмная ноч — цёмныя ночы
зімняя дарога — зімнія дарогі
тоўсты лёд — тоўстыя льды
ружовае воблака — ружовыя воблакі
белае поле — белыя палі

Прыметнікі змяняюцца па ліках. Прыметнік мае той самы лік, што і назоўнік, з якім прыметнік звязаны па сэнсе: *цёмная ноч* (***адз. л.***), *цёмныя ночы* (***мн. л.***). Прыметнікі множнага ліку адказваюць на пытанне я к і я? і маюць канчаткі **-ыя, -ія**. У множным ліку прыметнікі не змяняюцца па родах.

**2.** Прачытайце. Пастаўце словазлучэнні ў множным ліку. Запішыце па ўзоры.

У з о р: *іскрыст*|*ыя*|, *калюч*|*ыя*| *снягі.*

Вузкая лясная сцежка. Радасная, вясёлая песня. Прыгожае лясное возера. Топкае вялікае



Правообладатель Народная асвета

балота. Снежная, халодная зіма. Іскрысты, калючы снег.

Абазначце канчаткі прыметнікаў.

**3.** Складзіце словазлучэнні. Запішыце. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

як і я?

| | |
|---|---|
| сцяжынкі ... | норы ... |
| шапкі ... | завірухі ... |
| жыхары ... | вятры ... |

Выкарыстайце словы: *лёгкія, пушыстыя, халодныя, паўночныя, моцныя, лютыя, цёплыя, лясныя.*

**4.** Прачытайце. Устаўце прыметнікі з практыкавання **3**. Запішыце. Вызначце лік прыметнікаў.

З поўначы дзьмуць ... вятры. Надышла пара ... маразоў і ... завірух. Завеі замялі ... сцяжынкі. Заснуў лес пад ... шапкамі. Схаваліся ў ... норы ... жыхары.



**5.** Прачытайце. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца слова *горкі* ў кожным сказе.

Зімой усе горкі раскатаныя дзіцячымі лыжамі і санкамі. Паабапал дарогі расце горкі палын.

Спішыце. Падкрэсліце слова *горкі* адпаведнымі лініямі.



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце. Устаўце адпаведныя прыметнікі.

Дзед ведаў шмат ... казак. Вось яго казка пра хлеб.

Чалавек доўга харчаваўся ... травой, ... ягадамі, ... грыбамі, ... каранямі. А потым выдумаў хлеб. І дапамаглі яму ў гэтым ... сонейка, ... ветрык і ... вада.

Запішыце. Абазначце лік прыметнікаў.

Выкарыстайце словы: *цікавых, рознай, ляснымі, ядомымі, карыснымі, яснае, лагодны, крынічная.*

**2.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх. Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі. Абазначце іх род і лік.

1) У полі нарадзіўся,
у печы смачным зрабіўся.

2) Узялі шэрае, ды кінулі на чорнае,
вылезла зялёнае,
потым стала жоўтае.
Жоўтае касілі, білі, мітусілі.
Стала белым жоўтае.
Замясілі белае,
сунулі ў чырвонае,
выйшла — залацістае.

**хлеб** **хлебаро́б** **мітусі́цца** **шэ́рань**



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце тэкст.

## Поле

Шырока раскінулася хлебнае поле. Наліліся сокам зярняты збажыны і схілілі да долу спелыя каласы. Яны шапацелі, спявалі вясёлую песню, дзякавалі руплівым хлебаробам, цёпламу дожджыку, яркаму сонейку.

- Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.
- Выпішыце словазлучэнні *прыметнік* + *назоўнік*. Вызначце лік прыметнікаў.
- Апішыце малюнкі, якія можна было б зрабіць да гэтага тэксту. Запішыце 2-3 сказы. Падкрэсліце прыметнікі, абазначце іх лік.

**4.** Разгледзьце малюнкі. Падбярыце да кожнага назоўніка адпаведныя па сэнсе прыметнікі.



Узор: *хлеб* (які?) *духмяны.*

каравай (які?) ...
булкі (якія?) ...
пірагі (якія?) ...

Запішыце.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце і запомніце верш. Запішыце яго па памяці. Падкрэсліце прыметнікі. Вызначце іх род і лік.

Цешыць поле залатое.
Дзякуй, роднае, за тое,
што ўрадзіла гэтак шчодра,—
з хлебам жыць на свеце добра. *Я. Пушча.*

## 22

**1.** Прачытайце загадку. Адгадайце яе.

Звер маленькі, рыжаваты,
а хвост доўгі і калматы,
на дрэве жыве і шышкі грызе.

Па пытаннях складзіце апавяданне «**Вавёрка**».
Дзе жыве вавёрка?
Якая ў яе галоўка? Вушы? Хвост?
Дзе будуе вавёрка сваё гняздо?
Чым корміцца вавёрка?
Ці карысная вавёрка?

- Спішыце загадку. Вызначце лік прыметнікаў.
- Запішыце адказы на пытанні. Вызначце лік прыметнікаў.
- Запішыце 2-3 сказы на тэму «***Вавёрка рыхтуецца да зімы***». Выкарыстайце прыметнікі.

**2.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

Па дарозе ў школу дзеці спыніліся каля бяроз якія яны прыгожыя сёння як іскрацца на



Правообладатель Народная асвета

сонцы ледзяныя іголачкі на кожнай галінцы гэта — шэрань.

Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце лік прыметнікаў.

**3.** Прачытайце. Устаўце адпаведныя прыметнікі.

Аднойчы я пайшоў у лес. Раптам ... сцяжынку мне перабегла ... вавёрка. Яна ўзабралася на ... сасонку і скінула на мяне ... шапку снегу. А потым знікла.

Запішыце. Вызначце лік і род прыметнікаў.

Выкарыстайце словы: *лясную, шустрая, маладую, вялікую.*

**4.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх род і лік.

Вузкаю палоскаю на краі нябес
лёг за нашай вёскаю старадаўні лес.

**5.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх лік.

Марозная ноч ціха плыве над зямлёй. Ясныя зоркі гараць на цёмным небе. Яны прабіваюць ноч доўгімі струменьчыкамі святла. Спіць заснежаная зямля.

**сту́дзень** **сне́жань** **лю́ты** **імгла́**



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце прыметы надвор'я. Растлумачце сэнс.

Студзень пагодны — будзе год плодны.

Калі студзень імглісты — мокры год, а калі халодны — позняя вясна і халоднае лета.

Выпішыце словазлучэнні *прыметнік + назоўнік*. Пастаўце пытанні да прыметнікаў. Вызначце іх лік.

Узор: *студзень* (які?) *пагодны* (***адз. л.***).

**2.** Прачытайце тэкст **«Зімовы лес»**. Устаўце патрэбныя прыметнікі. Запішыце. Вызначце лік прыметнікаў.

Цікава пабываць у ... лесе. ... лес апрануў елку ў ... ўбранне. Закінуў дрэвы і кусты ... снегам. Апускаюцца ... сняжынкі на ... лес, укрываюць яго ... коўдрай, хаваюць ад ... маразоў.

Выкарыстайце словы: *зімовым, зімовы, снежнае, белым, пушыстыя, зачараваны, цёплай, лютых.*

Вусна апішыце зімовы лес.

**3.** Прачытайце словы. Складзіце сказы. Запішыце.

воўк, галодны, лесе, па, заснежаным, блукае
ліса, асцярожная, на, палюе, мышэй
зайцы, кустоў, галінкі, аб'ядаюць, палахлівыя
дзяўбуць, ягады, чырвоныя, рабіны, снегіры



Правообладатель Народная асвета

лушчыць, арэхі, вавёрка
яловыя, дзяцел, дзяўбе, шышкі

Падкрэсліце прыметнікі. Вызначце іх лік.

**4.** Прачытайце. Устаўце патрэбныя прыметнікі. Запішыце. Вызначце лік прыметнікаў.

Ідзе ... снег. Дзьме ... вецер. Трашчыць ... мароз. А дзеці будуюць ... горку. Яны ... і ... . Ім цёпла. Уцякай, ... мароз!

**Пагутарым.** Раскажыце пра цікавае здарэнне на горцы.

**5.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс. Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі. Вызначце іх род і лік.

*У родным лесе і куст родны. Ідзі ў родны край, там і пад елкай рай. З роднага боку і варона мілая.*

---

## 24

**1.** Прачытайце верш. Выпішыце назоўнік *верабейка.* Падбярыце да яго прыметнікі.

Верабейка-верабей
грэе лапкі на трубе.
Ён у вырай не ляцеў,
тут застацца захацеў. *С. Бестава.*

**Пагутарым.** Якія яшчэ птушкі не паляцелі ў вырай?



Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце. Устаўце прыметнікі.

... снегіры сядзяць на рабіне.

... вераб'і ціўкаюць пад страхой.

... вароны і ... сарокі шукаюць спажывы. Цінькаюць у садзе ... сініцы.

Запішыце. Вызначце лік прыметнікаў.

Выкарыстайце словы: *чырванагрудыя, шустрыя, шэрыя, белабокія, маленькія.*

**3.** Прачытайце тэкст.

### Снягір

Снягір — адна з самых прыгожых птушак. Галава, крылы і хвост у снегіра чорныя, шыя і спіна — блакітна-шэрыя, а брушка чырвонае. Кормяцца снегіры пупышкамі, насеннем раслін, ягадамі (*паводле В. Вольскага*).

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх род і лік.

**4.** Намалюйце словамі вераб'я і снегіра. Параўнайце гэтых птушак.



**5.** Прачытайце верш.

Ім завеі, і марозы,
і свінцовыя **вятры** —
невялікая **пагроза**,
бо ёсць добрыя **сябры**.



Правообладатель Народная асвета

Зробяць ім яны **кармушкі**
і пазбавяць ад бяды.
Верацъ, верацъ весялушкі,
што **сяброўства** — назаўжды. *М. Пазнякоў.*

Выпішыце выдзеленыя словы, падбярыце да іх адпаведныя прыметнікі.

25

1. Разгледзьце малюнак. Раскажыце, як дзеці дапамагаюць птушкам зімой.



Якая пара года на малюнку?
Што зрабілі дзеці?



Правообладатель Народная асвета

Як жывецца птушкам зімою?
Дзе дзеці павесілі кармушку?
Што дзяўбуць чырванагрудыя снегіры?
Што шукаюць маленькія сінічкі?
Чым жывяцца шустрыя вераб'і?
Як назіраюць дзеці за птушкамі?

Запішыце адказы на пытанні. Прыдумайце загаловак тэксту.

## 26 Белаве́жская пу́шча лось бабёр

**1.** Прачытайце тэкст. Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх лік.

Безліч звяроў насяляюць нашу Беларусь. Лясныя драпежнікі — гэта ваўкі, мядзведзі, рысі, куніцы. У лясах часта трапляюцца хутканогія алені, асцярожныя дзікі, прыгожыя ласі. Працавітыя бабры пасяляюцца на рэках. А ў Белавежскай пушчы жыве лясны асілак — зубр (*паводле Я. Галубовіча*).

**2.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

Трашчыць галлё. Хістаюцца маладыя дрэўцы. Пад цяжарам вялікага цела прыгінаюцца да зямлі густыя кусты. Гэта ідзе дужы і велічны зубр. За ім паслухмяна крочаць маладыя зубры і маленькія зубраняты.

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх лік.


Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

1) Што за гаспадар лясны
спіць пад снегам да вясны,
ну, а летам да калод
ходзіць красці чужы мёд? *У. Мацвеенка.*

2) Скача, але не мяч,
шэры, але не хмара,
пушысты, але не футра.
Хто гэта?

- Спішыце загадкі. Падкрэсліце прыметнікі.
- Спішыце загадкі з адгадкамі. Падкрэсліце прыметнікі. Вызначце іх род і лік.
- Адкажыце на пытанні. Запішыце адказы.

Ці бачылі вы зайца? Якая ў зайца галава? Вушы? Хвост? Лапы? Якія зайцы зімой? Летам? Чым кормяцца зайцы? Ці карысныя зайцы?

**4.** Прачытайце. Устаўце адпаведныя прыметнікі.

**Зайцаў кажушок**

На двары трашчыць ... мароз. Дзьме ... вецер. Заяц апрануў ... кажушок. Цёпла яму. Ні ... воўк, ні ... лісіца не ўбачаць яго на ... снезе.

Спішыце. Вызначце род і лік прыметнікаў.



**5.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

1) Улетку шэранькі, узімку беленькі. Доўгія вушы мае, хутка ў лес уцякае.



Правообладатель Народная асвета

2) Сама пушыстая, футра залацістае, у лесе жыве, у вёсцы кур крадзе.

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх род і лік.

27

**1.** Прачытайце тэкст.

Каля дарогі стаяць разгалістыя ялінкі. Снег засыпаў іх кволыя верхавіны і ніжнія лапкі. Здалёк ялінкі быццам белыя хаткі. Нават ёсць круглыя акенцы і вузенькія дзверы. А ў сярэдзіне зусім няма снегу. Дол усцілаюць жоўтыя шыпулькі. Тут начуе шэры зайчык (*паводле А. Кулакоўскага*).

- Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі.
- Выпішыце словазлучэнні *прыметнік* + *назоўнік*. Вызначце лік прыметнікаў.
- Складзіце і запішыце 2-3 сказы на тэму «***Лес зімой***». Выкарыстайце прыметнікі.

**2.** Прачытайце верш «**Зіма**».

Мяккі снег лятае пухам,
і канца яму няма,
і нясе сярдзітым духам,
дзікім сіверам зіма. *Янка Купала.*

Спішыце. Абазначце лік і род прыметнікаў. Растлумачце сэнс слова *сіверам.* Звярніцеся да тлумачальнага слоўніка.



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце. Складзіце сказы са слоў кожнага радка.

пачалася, злосная, завіруха
вецер, пыл, закруціў, снежны
дрэвы, зашумелі, на, галасы, усе
у, пазачыняліся, хатах, людзі, цёплых
стрэхі, пад, птушкі, зашыліся
звяры, у, дзікія, гушчарах, пахаваліся

Запішыце тэкст, прыдумайце загаловак. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх лік.



**4.** Прачытайце скорагаворку спачатку павольна, а потым хутка.

Бык барадаты лёг на бок,
Бык барадаты — абібок.
Бык разлёгся на баку,
Нават бок баліць быку.

Спішыце. Запомніце скорагаворку.



**5.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.

1) Белы, лёгкі і пушысты,
ён заслаў зямлю ўсю чыста. (*н, е, г, с*)

2) Па небе плавае, іскрыстае, рухавае,
жыццё дае палеткам,
і збажыне, і кветкам. (*с, н, ц, а, о*)

Спішыце. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх лік і род.



Правообладатель Народная асвета

**1.** Да назоўнікаў *зіма, паветра, сонца, лес* падбярыце некалькі прыметнікаў. Запішыце. Вызначце род.

Узор: *зіма* (якая?) *снежная, халодная, вясёлая, марозная* (*ж. р.*).

**2.** Прачытайце. Змяніце прыметнікі, што ў дужках, як патрабуе сэнс. Запішыце.

Зіма-чараўніца закідала (*снежная*) гурбамі зямлю. (*Сонечны*) прамяні прабіваюцца праз (*густы*) галіны дрэў. (*Высокая*) елкі ціха пагойдваюцца ад ветру. Спяць пад (*снежная*) шапкамі (*высокая*) сосны.

- Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй. Вызначце іх лік.
- Знайдзіце словазлучэнні *прыметнік* + *назоўнік*. Выпішыце 3 словазлучэнні (*на выбар*). Вызначце іх лік.
- Які малюнак можна было б зрабіць да гэтага тэксту? Запішыце яго апісанне 2-3 сказамі.

**3.** Прачытайце і запомніце верш. Запішыце яго па памяці. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх род і лік.

Гэта смелы крыжадзюб,
не баіцца ён завей.
Лес яловы вельмі ж люб
для яго малых дзяцей. *В. Вітка.*



Правообладатель Народная асвета

**4.** Прачытайце. Замест кропак устаўце патрэбныя прыметнікі. Запішыце. Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку лексічнае значэнне слова *шэрань.*

… мароз шчыпле твар.
Вые … завіруха.
… снег рыпіць пад нагамі.
Дрэвы пакрыліся … шэранню.
Мароз малюе на вокнах … ўзоры.

- Падкрэсліце прыметнікі хвалістай лініяй.
- Вызначце род і лік прыметнікаў.
- Прыдумайце сказы з прыметнікамі *прыгожы, зімовая*. Запішыце.

**5.** Прачытайце тэкст. Ад назоўнікаў, што ў дужках, утварыце прыметнікі.

Мы жывём у (*лес*) краі. Нашы лясы прыгожыя і багатыя. Беражыце (*Беларусь*) лясы!

Запішыце. Вызначце род і лік прыметнікаў.
Са словам *Беларусь* прыдумайце сказ.

## 29

**1.** Прачытайце. Спішыце.

У школе мы вывучаем родную мову. Наша мова — беларуская. На роднай мове мы размаўляем, вучым вершы беларускіх паэтаў, спяваем родныя песні. Мы любім сваю мову.

Вызначце род і лік прыметнікаў.


Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх.






1) Электрычны, мілагучны,
ён усім вядомы вучням.
Звонка кліча на ўрок,
заліваецца … .
2) Аднолькавыя лісточкі
ў адной скрынцы жывуць,
людзям веды нясуць.

Спішыце. Вызначце род і лік прыметнікаў.

**3.** Прачытайце тэкст. Ці ўсё ў ім правільна?

**Лета**

Летам вельмі холадна, марозна. Вакол ляжыць белы снег. Дзеці катаюцца з горкі на санках і лыжах, гуляюць у хакей. Летам у госці да нас прыходзіць цудоўнае свята — Новы год.

Запішыце тэкст без памылак.
Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх род і лік.

**4.** Прачытайце пытанні. Адкажыце на іх.

Дзе вы бераце кнігі для чытання?
Якія кнігі вы любіце чытаць?
Хто з герояў вам асабліва падабаецца?
Да каго з іх вы хацелі б быць падобнымі?

Запішыце словы, якія называюць добрыя рысы характару чалавека.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце. Устаўце замест кропак адпаведныя прыметнікі. Запішыце сказы.

**Зіма халодная, а лета ... .**
**Зімовы дзень кароткі, а летні ... .**
**Зімой халодны снег, а летам ... дождж.**
**Зімой пякучыя маразы, а летам ... навальніцы.**

Вызначце лік і род прыметнікаў.

---

**30**

**1.** Прачытайце тэкст і адкажыце на пытанні. Запішыце адказы.

## Снегавік

**У агародчыку Дзіма зляпіў снегавіка. Замест вачэй уторкнуў чорныя вугальчыкі. Нос зрабіў з вялікай морквы. У рукі снегавіку даў скрыначку і насыпаў туды зярнят. Першая прыляцела сінічка, потым снягір. Чорная галка таксама заўважыла кармушку, але падляцець баялася. Птушкі зярняткі падзяўблі і разляцеліся. Галка скокнула на кармушку, а там пуста. Яна схапіла моркву. І снегавік застаўся без носа.**

Дзе зляпіў Дзіма снегавіка?
Як ён выглядаў?
Што было ў скрыначцы?
Якія птушкі прыляцелі да снегавіка?
Як паводзіла сябе галка?
Чаму снегавік застаўся без носа?


Правообладатель Народная асвета

В ы к а р ы с т а й ц е  с л о в ы: *у агародчыку, уторкнуў, вугольчыкі, скрыначку, насыпаў, зярнят, сінічка, снягір, заўважыла, падляцець, баялася, падзяўблі, разляцеліся, схапіла.*

### ***Што мы ведаем?***

**1.** Якая часціна мовы называецца прыметнікам? Чаму яна атрымала такую назву?

**2.** Для чаго выкарыстоўваюцца прыметнікі ў тэксце?

**3.** Як змяняюцца прыметнікі?

**4.** Як вызначыць род і лік прыметнікаў?

## Дзеяслоў

**31**

**1.** Прачытайце верш. Ад выдзеленых назоўнікаў пастаўце пытанні да слоў, якія абазначаюць дзеянні.

Здароў, марозны звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы мяккі снег!
**Мяцель** не вее, сціхнуў **вецер**,
і волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя **бярозы**
Над сінявой начной стаяць,
У небе **зоркі** ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць... *М. Багдановіч.*

Запішыце назвы дзеянняў разам з назоўнікамі.

У з о р: *мяцель* (ш т о  р о б і ц ь?) ***не вее***.



Правообладатель Народная асвета

**2.** Успомніце, чым займаюцца вучні на ўроках матэматыкі, рытмікі, фізкультуры. Запішыце назвы дзеянняў. Пастаўце вусна да гэтых слоў пытанні.

**3.** Прачытайце загадку і адгадайце. Запішыце. Пастаўце ў дужках пытанні да слоў, якія называюць дзеянні.

У зямлі (...) сядзіць, хвост уверх (...) глядзіць, можна цукар з яго (...) зрабіць і смачны боршч (...) зварыць.

**Пагутарым.** Ці ведаеце вы, як трэба варыць боршч? Раскажыце.

**Дзеяслоў** — гэта часціна мовы, якая называе дзеянне прадмета.

Дзеясловы адказваюць на пытанні што робіць? што зробіць? што будзе рабіць? што рабіў? і інш.: *піша*, *напіша*, *будзе пісаць*, *пісаў*.

**4.** Прачытайце прыказку. Растлумачце яе сэнс. Назавіце дзеясловы. Спішыце. Падкрэсліце дзеясловы дзвюма прамымі лініямі.

*Хто працуе, той не сумуе.*

**5.** Прачытайце. Спішыце. Дзеясловы падкрэсліце дзвюма прамымі лініямі.



Правообладатель Народная асвета

Зачыняйце шчыльна хату,
каб не дзьмулі халады.
На акно кладзіце вату,
каб не клаў мароз сляды. *Я. Колас.*

## 32

**1.** Да назоўнікаў падбярыце адпаведныя па сэнсе дзеясловы і ўтварыце сказы.

| | |
|---|---|
| вучні | поўзаюць |
| птушкі | ідзе |
| дождж | грыміць |
| ракі | майструюць |
| гром | спяваюць |

Запішыце сказы. Падкрэсліце назоўнікі адной прамой лініяй, а дзеясловы — дзвюма.

Узор. *Вучні* (што робяць?) *майструюць*.

Са словамі якой часціны мовы звычайна звязваюцца дзеясловы па сэнсе?

**2.** Падбярыце да назоўнікаў аднакаранёвыя дзеясловы. Запішыце словы парамі па ўзоры:

Узор: *хадзьба — хадзіць.*

погляд — ...
друкарня — ...
сігнал — ...
жыццё — ...

**3.** Пры дапамозе прыставак утварыце іншыя дзеясловы па ўзоры.

Узор: *пісаць — перапісаць.*



Правообладатель Народная асвета

бяліць — ...  
габляваць — ...

спяваць — ...  
расці — ...

- Абазначце прыстаўкі ва ўтвораных дзеясловах.
- Запішыце слова *бяліць* з прыстаўкамі ***ад-***, ***па-***, ***за-***. Чым адрозніваюцца словы?
- Складзіце і запішыце 2 сказы са словамі з прыстаўкамі.

**4.** Падбярыце да прыметнікаў аднакаранёвыя дзеясловы. Запішыце словы парамі па ўзоры:

Узор: *зялёны — зазелянець.*

смелы — ...  
моцны — ...

дружны — ...  
белы — ...

**му́ляр** **маля́р** **тынко́ўшчык**

**5.** Прачытайце. Дапоўніце сказы словамі, якія абазначаюць дзеянні. Запішыце. Падкрэсліце дзеясловы.

**Хто дом будуе**

Муляры (што робяць?) ... сцены. Тынкоўшчык (што робіць?) ... сцены. Маляр (што робіць?) ... вокны, падлогу.

Выкарыстайце словы: *фарбуе, кладуць, атынкоўвае.*

**Пагутарым.** Ці падабаюцца вам гэтыя прафесіі? Кім бы вы хацелі быць?



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце. Падумайце, якімі дзеясловамі можна дапоўніць сказы. Запішыце сказы.

Дождж ідзе, ..., ..., ... . Вада цячэ, ..., ..., ... . Вецер гудзе, ..., ..., ... .

Выкарыстайце словы: *булькае, лье, свішча, сыпле, льецца, цурчыць, вые, стогне, капае, дзьме*.

Колькі гукаў і колькі літар у слове *цурчыць*?

**2.** Прачытайце дзеясловы. З правага слупка падбярыце да іх дзеяслоў з блізкім значэннем.

| | |
|---|---|
| уяўляцца, мроіцца | здавацца |
| лаяць, адчытваць, бэсціць | крычаць |
| страшыць, пужаць, паграждаць | палохаць |

Запішыце дзеясловы ў адзін радок.
Са словамі правага слупка складзіце два сказы.

**3.** Прачытайце словы. Складзіце сказы.

Ляжыць (*снег, мядзведзь*). Гуляе (*дзіця, вецер*). Ідзе (*чалавек, гадзіннік*). Звініць (*званок, песня*).

- Запішыце 4 сказы (*на выбар*).
- Запішыце сказы са словамі, якія ўжыты ў *прамым* значэнні. Падкрэсліце дзеясловы.
- Запішыце сказы са словамі, якія ўжыты ў *пераносным* значэнні. Падкрэсліце дзеясловы.


Правообладатель Народная асвета

**4.** Прачытайце. Да дзеясловаў падбярыце словы з супрацьлеглым значэннем. Запішыце.

**апярэдзіць — ..., ачарніць — ..., багацець — ..., вешаць — ..., весяліцца — ..., верыць — ... .**

**Выкарыстайце словы:** ***сумнявацца, знімаць, беднець, адстаць, абяліць, сумаваць.***

**5.** Адгадайце загадкі. Спішыце.

1) Без крыл лятае, без ног бяжыць.

2) Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае.

Падкрэсліце дзеясловы з супрацьлеглым значэннем.

Прыдумайце сказ са словам *бяжыць*.

## 34

**1.** Прачытайце.

А за сцяной смяецца поле. На лузе кіпіць работа. Вясёлая песня льецца з акна.

- Запішыце сказы. Падкрэсліце дзеясловы.
- Знайдзіце дзеясловы. Прыдумайце з імі сказы, каб кожны дзеяслоў ужываўся з іншым значэннем. Запішыце.
- Складзіце і запішыце сказы са словамі *плывуць, гараць* у прамым і пераносным значэнні.

**дзя́дзька** **дзядзі́нец** **сумёт** **ліхта́р**



Правообладатель Народная асвета



**2.** Прачытайце скорагаворкі спачатку павольна, а потым хутка. Запомніце іх. Спішыце. Падкрэсліце дзеясловы.

Дзяды і дзядзькі на дзядзінцы дзялілі дзялянкі. Белы бусел баяў байку беламу зайку.

**3.** Прачытайце сказы. Успомніце, як пішуцца прыстаўкі і прыназоўнікі. Запішыце. Абазначце прыстаўкі.

(*На*) ляцела (*на*) лес лютая навальніца. (*С*) пахмурнеў, (*за*) маркоціўся лес. (*Па*) дзьмуў моцны вецер. Шум, грукат ідзе (*па*) лесе. (*На*) лес (*на*) валіўся лівень.

**4.** Складзіце са слоў сказы. Прыдумайце загаловак. Запішыце. Падкрэсліце дзеясловы.

каля, снежная, самага, стаяла, мастка, баба

на, красаваўся, ёй, з, вялікі, каляровымі, капялюш, пёрамі

дзеці, яго, з, зрабілі, хваста, пеўня, пёраў



**5.** Прачытайце. Ці правільна вучні выбралі дзеясловы для сваіх сказаў? Выпраўце памылкі і запішыце сказы.

Я хачу напісаць прыход зімы. Дзяўчынка робіць задачу. Да Гомеля мы ехалі на катары па Дняпры.

Выкарыстайце словы: *плылі, рашае, апісаць*.



Правообладатель Народная асвета

# Змяненне дзеясловаў па ліках

35

**1.** Прачытайце. Вызначце, у якіх сказах выдзеленыя дзеясловы абазначаюць дзеянне аднаго прадмета, а ў якіх — дзеянне двух і больш прадметаў.

Хлопчык **любіць** сасновы бор. Часта **ходзіць** ён на лыжах па лясных дарожках. У сасновым бары ён не раз **сустракаў** зайца і лісу.

Хлопчыкі **любяць** сасновы бор. Часта **ходзяць** яны на лыжах па лясных дарожках. У сасновым бары яны не раз **сустракалі** зайца і лісу.

Спішыце сказы першага слупка. Падкрэсліце дзеясловы.

**2.** Прачытайце сказы.

Лыжнік бяжыць. Лыжнікі бягуць.

? На якое пытанне адказвае дзеяслоў у першым сказе? А на якое — у другім?
У якім ліку ўжываецца назоўнік у першым сказе? А ў другім?

Дзеясловы змяняюцца па ліках.

**У адзіночным ліку** дзеяслоў абазначае дзеянне аднаго прадмета і адказвае на пытанні **што раблю? што робіць? што рабіў? што рабіла?** і інш.: *чытаю, чытаеш, чытаў, чытала.*



Правообладатель Народная асвета

У **множным ліку** дзеясловы абазначаюць дзеянне двух і больш прадметаў і адказваюць на пытанні што робім? што робіце? што робяць? што рабілі? і інш.: *чытаем, чытаеце, чытаюць, чыталі.*

**3.** Прачытайце тэкст.

## Паясы

Трыста гадоў назад пояс (што рабіў?) лічыўся (***адз. л.***) бадай што самым галоўным упрыгожаннем у святочным адзенні. Паясы (...) насілі (...) не толькі багатыя людзі, але і сяляне. Іх (...) ткалі (...) з лёну ды воўны.

Потым паясы (...) ткалі (...) на слуцкай фабрыцы. Далёка (...) пайшла (...) слава пра тканыя паясы слуцкай фабрыкі.

Спішыце, пастаўце ў дужках пытанні да дзеясловаў. Вызначце іх лік (***адз. л.***), (***мн. л.***).

**4.** Дзеясловы *чытаць, танцаваць, рашаць, спяваць, хадзіць* пастаўце ў адзіночным і множным ліку.

Узор: што раблю? — *чытаю*; што робім? — *чытаем*

Складзіце 2 сказы. Запішыце.



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце. Змяніце лік дзеясловаў.

| адз. л. | мн. л. | адз. л. | мн. л. |
|---|---|---|---|
| булькае | ... | гаворыць | ... |
| засцілае | ... | глядзіць | ... |
| шукае | ... | спіць | ... |

Запішыце па ўзоры.

Узор: *піша — пішуць.*

**2.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце дзеясловы.

Апоўдні ўсхадзілася (***адз. л.***) завіруха. З нізкіх воблакаў падалі (...) камякі снегу. Вецер матляў (...) ліхтары на слупах. Шалёна вылі (...) правады. Каля школьнага ганка вырас (...) глыбокі сумёт.

Спішыце, у дужках абазначце лік дзеясловаў.

**3.** Прачытайце. Спішыце. Вызначце лік дзеясловаў.

Прыйдзе люты — спытае, як ты абуты. Люты наробіць плюты. Віхры і мяцелі ў лютым наляцелі. Завірухі і мяцелі ў лютым адгудзелі.

**4.** Прачытайце загадку і адгадайце яе.

Раджаецца моўчкі і моўчкі ляжыць,
памрэ — зараве і наўцёкі бяжыць.

Спішыце загадку з адгадкай. Падкрэсліце дзеясловы, вызначце іх лік.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце. Што пераблытана? Спішыце. Падкрэсліце дзеясловы, вызначце іх лік.

Кот фантан уверх пускае,
кіт сваім хвастом гуляе.
Як адрозніваць ката
ад пушыстага кіта?

Апішыце правільны малюнак, які б вы намалявалі па гэтым вершы.

## 37

**1.** Прачытайце тэкст і адкажыце на пытанні.

### Неразлучныя сябры

Янка і Пятрусь — неразлучныя сябры. Яны разам ходзяць у школу, займаюцца ў гуртку. Хлопчыкі добра вучацца.

Янка чытае кніжкі пра касманаўтаў, Пятрусь — пра маракоў. Янка любіць маляваць. Пятрусь захапляецца лёгкай атлетыкай. У кіно яны ходзяць разам.

Чаму хлопцаў называюць неразлучнымі сябрамі?
Як яны вучацца?
Якія кнігі любіць чытаць Янка? А Пятрусь?
Чым любіць займацца Янка? А Пятрусь?

Выкарыстайце словы: *ходзяць у школу, займаюцца ў гуртку, добра вучацца, пра кас-*



Правообладатель Народная асвета

*манаўтаў, маракоў, лёгкай атлетыкай, захапляецца.*

Запішыце пераказ па плане.

План

1. Неразлучныя сябры.
2. Занятак Янкі.
3. Захапленні Петруся.

38

**1.** Назавіце дзеясловы ў адзіночным і множным ліку. Вусна пастаўце пытанні да дзеясловаў. Запішыце.

| | |
|---|---|
| адз. л. | мн. л. |
| я чытаю | мы ... |
| ты ... | вы пішаце |
| ён ... | яны гуляюць |
| яна плача | яны ... |
| яно ... | яны цвітуць |

**2.** Прачытайце, змяняючы адзіночны лік выдзеленых слоў на множны. Ці змяняюцца іншыя словы ў сказе? Дайце загаловак тэксту.

Гэта было зімой. **Дзяўчынка** каталася на санках. Каля куста бэзу **яна** знайшла зламаную галінку.

**Дзяўчынка** прынесла яе дадому і паставіла ў збанок з вадою. Праз некалькі дзён распусцілася **пупышка**, з'явіўся зялёны лісточак. Паміж



Правообладатель Народная асвета

лісточкамі зацвіла фіялетавая кветка (*паводле В. Сухамлінскага*).

Запішыце зменены тэкст. Падкрэсліце дзеясловы. Колькі гукаў і колькі літар у слове *радасць*?

**3.** Складзіце словы з дадзеных складоў і падбярыце да іх дзеясловы. Запішыце.

лі, жу, раў — ...  
ка, дзяў, чын — ...  
доў, са, нік — ...  
нік, пеў — ...

Выкарыстайце словы: *ляцяць, кукарэкае, вырошчвае, гуляе, ходзіць, садзіць, крычаць, весяліцца.*

**4.** Складзіце 2-3 сказы на тэму «***Зіма***».

Выкарыстайце словы і словазлучэнні: *снег, замёў, дарогі, наступілі, марозныя дні, весела, на горцы, гуляюць, у снежкі, катаюцца, санкі, лыжы.*

**5.** Прачытайце тэкст «**Агеньчык**». Назавіце дзеясловы. Выпішыце іх. Вызначце лік дзеясловаў.

Надыходзіць зімовая ноч. Спіць вёска. Толькі ў школе працуе наш настаўнік.

Я сяджу каля акна. Хачу дачакацца, пакуль у школе пагасне агеньчык. Сон адольвае мяне.

Усхапіўся рана. Гляджу ў акно. Усе спяць. Толькі ў школе гарыць агеньчык (*паводле В. Сухамлінскага*).



Правообладатель Народная асвета

39

**1.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы. Запішыце правільна. Падкрэсліце дзеясловы.

## Люты

Люты — самы халодны месяц на Беларусі прыходзіць ён з моцнымі вятрамі і мяцеліцамі выпадае шмат снегу маразы даходзяць да сарака градусаў тады вымярзаюць сады цяжка прыходзіцца птушкам і дзікім жывёлам усё схавана пад снегам галадна і холадна.



**2.** Прачытайце скорагаворкі спачатку павольна, потым хутка. Спішыце.

Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне.

У барабаны барабанілі, барабанілі, панабарабаньваліся.

Падкрэсліце дзеясловы. Вызначце іх лік.

**3.** Складзіце сказы. Дайце загаловак тэксту. Запішыце. Вызначце лік дзеясловаў.

Сонца, усё, вышэй, з, ходзіць, небе, па, вышэй, кожным, днём, і.

Усё, і, цяплей, яно, зямлю, саграває, цяплей.

Плача, зіма.

Льюцца, слёзы, халодныя, яе.

Растае, палі, снег, пакідае, і.



**Пагутарым.** Раскажыце, якое надвор’е бывае ў канцы зімы.



Правообладатель Народная асвета

**4.** Прачытайце загадкі і адгадайце.



1) Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастае, паху не мае, зімой вырастае.

2) Зімой расце коранем уверх, а вясной памірае. Хто адгадае?

- Спішыце загадкі. Падкрэсліце дзеясловы.
- Выпішыце дзеясловы. Запішыце іх у множным ліку.
- З дзеясловамі множнага ліку складзіце сказы і запішыце.



**5.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце дзеясловы. Вызначце іх лік.

**Лясны волат**

Трашчыць галлё. Хістаюцца маладыя бярозы. З гушчару выходзіць магутны звер. Гэта зубр.

## 40 Змяненне дзеясловаў па часах

**1.** Прачытайце. Вызначце, дзеянне ўжо адбылося, адбываецца ці будзе адбывацца.

Славу Радзімы (...) стваралі і (...) ствараюць многія-многія людзі. Адны (...) заваявалі славу, а другія (...) стаяць на варце яе. А трэція, калі (...) вырастуць, (...) будуць памнажаць нашу сла-



Правообладатель Народная асвета

ву. Але самыя вялікія героі — гэта тыя, што (...) не пашкадавалі свайго жыцця ў імя Радзімы (*К. Кірэенка*).

Спішыце, у дужках пастаўце пытанні да дзеясловаў.

**Хаты́нь** **Радзі́ма** **сялі́ба** **абуджа́ць**

**2.** Прачытайце. Вызначце, калі адбывалася дзеянне. Спішыце, у дужках пастаўце пытанні да дзеясловаў.

Дарогу ў беларускую вёску Хатынь (...) ведаюць мільёны людзей. Але людзі ў Хатыні (...) не жывуць. На сялібах (...) стаяць толькі коміны. Трывожна (...) звоняць званы. (...) Не замоўкнуць званы, (...) будуць абуджаць памяць людзей.

**Пагутарым.** Ці былі вы ў Хатыні? Якія пачуцці ў вас узніклі, калі пачулі званы?

Дзеяслоў змяняецца па часах.

Дзеяслоў мае тры часы: **цяперашні** (што робіць? што робяць?), **прошлы** (што рабіў? што рабілі? што зрабілі?) і **будучы** (што зробіць? што зробяць? што будзе рабіць? што будуць рабіць?).



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце тэкст *А. Марціновіча*.

Падыходжу да плошчы Перамогі і бачу незвычайную вахту ля Вечнага агню: чацвёрка школьнікаў.

І я ўяўляю, што гэтыя хлапчукі — праўнукі тых, у памяць каго гарыць гэты Вечны агонь.

Выпішыце дзеясловы і абазначце іх час: ***ц. ч.*** — цяперашні, ***пр. ч.*** — прошлы, ***б. ч.*** — будучы час.

**4.** Змяніце дзеясловы па часах. Запішыце.

| што рабіў? | што робіць? |
|---|---|
| *вёў* | *вядзе* |
| абараняў | ... |
| клапаціўся | ... |
| помніў | ... |

што будзе рабіць?

*будзе весці*

... ...

... ...

... ...

**5.** Утварыце дзеясловы цяперашняга, прошлага і будучага часу ад слова *берагч*ы. Складзіце і запішыце тры сказы. Вызначце час дзеяслова.

Праверце сябе: **берагу́ць, збераглі́, зберагу́ць.**



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце. Вызначце час дзеясловаў.

Я нарадзіўся беларусам,
беларусам буду жыць!
Мову родную вучуся
шанаваць, цаніць, любіць.

Сваю родную старонку
я люблю, як і бацькоў,
што вучылі песні звонкай,
прывівалі мне любоў.

Я клянуся: не зракуся
сваё роднае любіць.
Быў і буду беларусам,
пакуль толькі буду жыць.
*В. Швед.*

Спішыце апошні слупок верша. Падкрэсліце дзеясловы.

Як вы разумееце выраз «*не зракуся сваё роднае любіць*»?

**2.** Прачытайце сказы.

Якая яна, мая зямля? Гэта светлыя ад бяроз гаі, што (ш т о з р а б і л і?) аглухлі (***мн. л.***) ... ад птушынага звону, пушчы, дзе горда (...) нясуць (...) свае кароны алені. Гэта бясконцыя жылы рэк, у якіх (...) плешчуцца (...) бабры і рыба на захадзе сонца (*У. Караткевіч*).



Правообладатель Народная асвета

Спішыце. У дужках пастаўце пытанні да дзеясловаў і вызначце іх лік.

**3.** Прачытайце скорагаворку спачатку павольна, а потым хутка. Запішыце. Падкрэсліце дзеясловы.

Стругаў, стругаў — не дастругаў, стаў дастругваць — перастругаў.

**4.** Прачытайце словы.

раса, на, **зіхаціць**, ранішняя, траве

- Складзіце і запішыце сказ. Падкрэсліце дзеяслоў.
- Да выдзеленага дзеяслова падбярыце і запішыце 3-4 словы з блізкім значэннем.
- Да выдзеленага дзеяслова падбярыце словы з блізкім значэннем. Утварыце ад гэтых слоў дзеясловы цяперашняга, прошлага і будучага часу. Запішыце.

**5.** Прачытайце. Знайдзіце дзеясловы.

**Свавольнікі**

Два мядзведзі — Мішкі
Падкідалі шышкі.
Як скакалі праз кусты,
Дык абшарпалі хвасты.

Селі побач на пяньку
Пад ялінамі ў цяньку,



Правообладатель Народная асвета

Плачуць, азіраюцца —
Будзе мама лаяцца.

*С. Шушкевіч.*

42

**1.** Прачытайце тэкст і адкажыце на пытанні.

Прыйшла мама з работы і пачала ў кватэры прыбіраць. Напрацавалася, села ў крэсла і кажа:

— Нешта галава разбалелася. Адпачну крыху, дачушка. Потым падлогу памыю.

Лягла мама на ложак і заснула. Паглядзела Настачка: мама спіць. Дачушка накрыла маму хусткай. Сама выйшла на пальчыках са спальні. Дзверы за сабой ціхенька прычыніла. Няхай паспіць мама, а яна тут, у другім пакоі, пагуляе. Потым Настачка перадумала і сама памыла падлогу (*паводле Я. Бяганскай*).

Што рабіла мама, прыйшоўшы з работы?
Што яна сказала, напрацаваўшыся?
Што зрабіла дачушка?

Выкарыстайце словы і словазлучэнні: *прыбіраць у кватэры, напрацавалася, разбалелася, лягла адпачыць, накрыла хусткай, прычыніла ціхенька, перадумала, памыла падлогу.*

Запішыце пераказ. Прыдумайце загаловак.



Правообладатель Народная асвета

Прыкладны план

1. Прыйшла мама з работы.
2. Мама прылягла адпачыць.
3. Дзяўчынка прыбірае ў пакоі.

## Правапіс *не* з дзеясловамі

43

**1.** Прачытайце. Параўнайце прыказкі і скажыце, які сэнс яны маюць у адным і другім слупках. Што надае ім супрацьлеглае значэнне?

| | |
|---|---|
| *Рукі працягнеш — і з паліцы дастанеш.* | *Рукі **не** працягнеш — і з паліцы **не** дастанеш.* |
| *Чаго сабе хочаш, таго і другому зыч.* | *Чаго сабе **не** хочаш, таго і другому **не** зыч.* |

Спішыце прыказкі правага слупка і падкрэсліце дзеясловы з **не**.

**2.** Прачытайце верш **«Пустыя кармушкі»**. Чаму верш мае такую назву? Выпішыце **не** з дзеясловамі.

У школьным садзе дзеці
павесілі кармушкі,
каб у мароз і вецер
не галадалі птушкі.

Нацешыліся ўволю
каля кармушак-хатак,



Правообладатель Народная асвета

не крышаць хлеба болей,
не сыплюць і зярнятак.

І аблятаюць птушкі
і сад, і хаткі тыя:
не радуюць кармушкі,
калі яны пустыя. *М. Маляўка.*

**Пагутарым.** Ці дапамагаеце вы птушкам зімой?

**Не** з дзеясловамі пішацца асобна: ***не чытае, не ідзе.***

**3.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце **не** з дзеясловамі.

**Накарміце птушак**

Моцныя маразы, нават нам, людзям, не падабаюцца. А птушкам няма ад іх ніякай радасці.

Калі маленькая птушка за дзень не знойдзе ежы, уначы яна загіне. Трэба дапамагаць птушынай малечы. Хто чым можа.

**4.** Прачытайце тэкст. Спішыце, раскрываючы дужкі.

Зіма. (*Не*) зелянеюць на дрэвах лісточкі. (*Не*) спяваюць у садах птушкі. Туляцца яны ад холаду і голаду.

Успомніў я пра рабіну. Дастаў з гарышча і развесіў гронкі рабіны на галінках.



Правообладатель Народная асвета

Паляцелі сінічкі, чачоткі, вераб'і. (*Не*) устрымаліся і снегіры.

**5.** Складзіце і запішыце тры сказы з дзеясловамі *не загінуць, не замерзне, не будзе.*

**44**

**1.** Прачытайце.

### Сяброўкі

Алеся і Аленка вучыліся ў адным класе. Дзяўчынкі (*не*) разлучаліся нідзе. Казалі, што іх вадой (*не*) разальеш. Калі Алеся штосьці (*не*) разумела, яна звярталася да сяброўкі. І Аленка ніколі (*не*) адмаўляла.

Спішыце, раскрываючы дужкі. Колькі гукаў і колькі літар у слове *штосьці*?

Разбярыце па саставе словы *вадой, дзяўчынкі*.

Як вы разумееце выраз «*вадой не разальеш*»?

**2.** Вусна адкажыце на пытанні.

Хто твой сябар? Колькі яму гадоў? Дзе ён жыве? У якім класе вучыцца сябар? Ці добра ён вучыцца? Што табе ў ім падабаецца? Чым вы захапляецеся, як праводзіце вольны час?

Складзіце і запішыце 3-4 сказы на тэму «***Мой сябар***» («***Мая сяброўка***»).

Правільна пішыце **не** з дзеясловамі.



Правообладатель Народная асвета

В ы к а р ы с т а й ц е  с л о в ы: (**не**) *падвядзе*, (**не**) *пакіне*, (**не**) *падлізваецца*, (**не**) *падманвае*, (**не**) *забудзе*.

**3.** Прачытайце верш. Вымаўляйце сказы з правільнай інтанацыяй.

— (*Не*) адхопіш новай двойкі?
— (*Не*) пачнеш у школе бойкі?
— (*Не*) уцячэш з урока спеваў?
— (*Не*) палезеш больш на дрэва?
— (*Не*) напішаш на сцяне?
Стась на ўсё адказваў:
— Не! *А. Бачыла.*

Які загаловак можна даць вершу? Спішыце верш, раскрываючы дужкі.

**4.** Пастаўце дзеясловы ў цяперашнім часе.

не чапаў, не крычаў, не бегаў, не насіў, не шукаў

- Запішыце па ў з о р ы: *не чапаў — не чапае*. Падкрэсліце **не**.
- Складзіце два сказы з дзеясловамі з **не** і запішыце.
- Складзіце 2-3 сказы на тэму «***Паслухмяны хлопчык***». Выкарыстайце дзеясловы з **не**.

**5.** З дадзеных слоў складзіце прыказку. Растлумачце яе сэнс.

*Пакуль, урок, каток, на*, (**не**) *спяшайся*, (**не**) *вывучыў*.



Правообладатель Народная асвета

**45**

**1.** Прачытайце. Запішыце, раскрываючы дужкі. Разбярыце па саставе словы *галінак, засухі*.

### Прыяцель лесу

Прыяцель лесу (*не*) ломіць галінак, (*не*) абдзірае кары з дрэў. Ён (*не*) гне і (*не*) выварочвае маладыя дрэўцы. Прыяцель лесу (*не*) разбурае гнёздаў. Дзе лясы, там (*не*) бывае засухі.


**Пагутарым.** Як трэба паводзіць сябе ў лесе?

**2.** Прачытайце. Растлумачце напісанне **не** з дзеясловамі. Спішыце, раскрываючы дужкі.

Мала ў нас мясцін, дзе б (*не*) было балоцістых нізін. Яны (*не*) прываблiваюць да сябе. Па неасушаных балотах (*не*) праехаць і нават (*не*) прайсці. Але прырода (*не*) абдзяліла іх багаццем. Найбольшае багацце — торф.

**3.** Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Спішыце. Падкрэсліце **не** з дзеясловамі.

### Дарога

Старая дарога была балацяная.

Прыехалі рабочыя.

(*Не*) нарадуюцца вяскоўцы.

Асабліва гразка было на ёй вясной і ўвосень.

Яны пакрылі дарогу асфальтам.

Раней да вёскі (*не*) хадзіў аўтобус.



Правообладатель Народная асвета

Зараз у школу дзеці (*не*) ходзяць пешшу, а ездзяць на аўтобусе.

**4.** Прачытайце. Спішыце, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце дзеясловы. Растлумачце сэнс кожнага сказа.

**Шануйце ўсё жывое**

(*Не*) тапчы травіцы, хадзі сцежачкай. (*Не*) чапай, (*не*) ламай гэтага дубочка або сасонкі. (*Не*) паламай, не адвіхні галінку ў яблыні. (*Не*) хадзі праз жыта нацянькі (*паводле У. Дубоўкі*).



**Пагутарым.** Як адносяцца вашы сябры да прыроды? Раскажыце.



**5.** Прачытайце. Спішыце. Вызначце час дзеясловаў.

Прыўзнялося сонца. Залацісты прамень пранізаў кроплю. Успыхнула яна, загарэлася, засвяцілася сіне-зялёным агнём.

Ідуць ад яе ва ўсе бакі зялёныя праменьчыкі. Так нараджаецца казачная зорка (*паводле З. Бяспалага*).

**46**

**1.** Прачытайце. Спішыце, раскрываючы дужкі.

Надвор'е (*не*) нагрэеш. Надвор'е (*не*) пераменіш. Надвор'е толькі прадказаць можна. Хто ў прыродзе — жывы барометр?



Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце. Спішыце. Вызначце час і лік дзеясловаў.

### Жывы барометр

1) Сонца заходзіць у чырвоныя хмары — зласлівы вецер абудзіць абшары. 2) Лес без ветру шуміць — дождж спяшаецца, бяжыць. 3) Мак таўкуць камары — цёпла будзе на дворы (*В. Лукша*).

**Пагутарым.** Якія народныя прыметы вы ведаеце?

**3.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце сэнс. Запішыце, раскрываючы дужкі.

*Пра лугі (**не**) забудзеш — без сена (**не**) будзеш. Хто пчол (**не**) даглядае, той мёд (**не**) спажывае. Хто (**не**) працуе, таму (**не**) шанцуе.*

**4.** Прачытайце словы. Запішыце іх з **не**.

клікаць, камячыць, пілаваць, фарбаваць, крыўдзіць, вітацца

Узор: *клікаць — не клікаць, ...* .

**5.** Прачытайце. Спішыце. Вызначце час дзеясловаў.

Узыходзіла сонца. Паляўнічы спыніўся, прыслухаўся да цішыні. Раптам убачыў лісіцу на тым баку ракі. Яна бегла, распушыўшы хвост. Нечакана спынялася, разграбала лапамі снег. Лісіца мышкавала (*паводле А. Асіпенкі*).



Правообладатель Народная асвета

**пралéска** **бабýля** **8 Сакавікá** 

**1.** Прачытайце сказ. Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні. Дайце імёны дзецям.

**8 Сакавіка — свята любімых мам, бабулек, сястрычак і ўсіх жанчын.**



Якое свята 8 Сакавіка?
Каго віншуюць у гэты дзень?
Што падрыхтавалі дзеці маме і бабулі?
А што падрыхтаваў тата?
Які настрой у мамы і бабулі?



Правообладатель Народная асвета

Напішыце сачыненне **«Свята жанчын»**.

Прыкладны план

1. 8 Сакавіка — свята ўсіх жанчын.
2. Падарункі да свята.
3. Віншаванне таты.
4. Святочны настрой.

Выкарыстайце словы: *віншуюць, купілі, рыхтуюць, спяклі, смачны, торт, падарункі, кветкі, святочны, настрой, задаволеныя.*

**Пагутарым.** Якія падарункі да свята 8 Сакавіка вы падрыхтавалі сваім мамам? Раскажыце.

**48**

**1.** Прачытайце верш.

**Вясна**

Зноў зіму праганяе вясна,
зноў жаўрук яе ў полі вітае.
Зашумела над кручай сасна.
Пры дарозе вярба расцвітае.
Хутка сонца засвеціць ясней.
Хутка май упрыгожыць паляны.
І зашэпчуць лясы аб вясне,
зелянінаю лісцяў прыбраны.

*А. Куляшоў.*

Выпішыце дзеясловы ў тры слупкі.

***Ц. ч.*** ***Пр. ч.*** ***Б. ч.***



Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце. Выпішыце дзеясловы. Вызначце іх час і лік.

Ціхая раніца. Сонейка толькі што ўзышло. У полі ляжыць снег. Толькі ўзгоркі чарнеюць. Лужынкі за ноч сцягнуліся лядком. Прыгрэе зараз сонца, добра будзе на двары. Нешта зазвінела ў небе тонкім срэбраным званочкам. Гэта жаваранак.

**3.** Прачытайце і адкажыце на пытанні. Запішыце адказы. Вызначце час дзеясловаў.

Якая пара года наступіць пасля зімы?
Якія падуюць вятры?
Чым пакрыецца зямля? Дрэвы, кусты?
Якая пара года табе падабаецца і чаму?

**4.** Разгадайце рэбус. Запішыце атрыманы сказ.




**5.** Складзіце і запішыце тры сказы на тэму ***«Хутка вясна прыйдзе»***.



Правообладатель Народная асвета

### *Што мы ведаем?*

**1.** Якая часціна мовы называецца дзеясловам?

**2.** Як змяняюцца дзеясловы?

**3.** Як вызначыць лік дзеяслова? Прывядзіце прыклады.

**4.** Як вызначыць час дзеяслова? Прывядзіце прыклады.

**5.** На якія пытанні адказваюць дзеясловы цяперашняга часу?

**6.** На якія пытанні адказваюць дзеясловы будучага часу?

**7.** На якія пытанні адказваюць дзеясловы прошлага часу?

**8.** Як пішацца **не** з дзеясловамі? Прывядзіце прыклады.

49

## Прыназоўнік

**1.** Прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на словы, якія стаяць перад выдзеленымі словамі. Спішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі. Як пішуцца прыназоўнікі са словамі?

Дзеці былі ў **лесе.** На **дрэве** ўбачылі птушынае гняздо. **У ім** сядзелі птушаняты. Раптам адно птушаня выпала з **гнязда.** Дзеці пасадзілі птушаня ў **гняздо.**

**Пагутарым.** А як паступілі б вы? Чаму?



Правообладатель Народная асвета

**2.** Прачытайце сказы. Устаўце патрэбныя прыназоўнікі. Выкарыстайце схемы прыназоўнікаў.

 полем сцелецца нізкі туман. Сабака Шарык ляжаў  лавачкай.  хаты расла маладая бярозка. Тата ўвайшоў  хату.

Запішыце сказы. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**3.** Прачытайце. Устаўце патрэбныя прыназоўнікі. Запішыце сказы. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Спяць яшчэ **...** снегам паплавы, палеткі (*П. Прануза*). Сонейка **...** бору ранкам выглядае (*П. Броўка*). Шар **...** нітцы каляровы запусціў **...** неба Вова (*П. Пруднікаў*).



**Пагутарым.** Што вы больш любіце: лес з ягадамі, грыбамі, дрэвамі ці бібліятэку, у якой багата самых розных кніг з казкамі, малюнкамі? Ці былі вы ў Нацыянальнай бібліятэцы?

**4.** Спішыце верш. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Дождж прайшоў,
і над пасёлкам,
і на ўвесь палетак
**зіхаціць** дуга-вясёлка,
як вяночак з кветак.

*Л. Шырын.*



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце тэкст **«Бярозавы гай»**.

Пад блакітным небам, пад ласкавым сонцам красаваўся бярозавы гай. Хмары палівалі яго дажджом. Птушкі спявалі песні ў гаі. Людзі адпачывалі ў засені бяроз і любаваліся іх прыгажосцю (*паводле Л. Прокшы*).

Выпішыце сказы з прыназоўнікамі. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Колькі літар і колькі гукаў у слове *дажджом*?

## 50

**1.** Прачытайце. Устаўце патрэбныя прыназоўнікі. Са словазлучэннямі складзіце і запішыце сказы.

растуць  дарогі бяжыць  полі

схаваўся  дрэва гуляюць  стадыёне

**2.** Прачытайце скорагаворкі спачатку павольна, а потым хутка.

На парце карта, пад картаю парта. Да шыпшыны па шашы хутка беглі мурашы.

Спішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі разам са словамі, да якіх яны адносяцца.

**3.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

Сасновы бор пераходзіць (*у*) змешаны лес (*для*) глушцоў тут любімыя мясціны (*пад*) яліна-



Правообладатель Народная асвета

мі яны хаваюцца (*ад*) ястраба (*паводле В. Вольскага*).

Запішыце, раскрываючы дужкі.

**4.** Прачытайце пытанні і адкажыце.

Дзе працуе настаўнік?
Дзе працуе даярка?
Дзе працуе трактарыст?
Дзе працуе ўрач?

Запішыце адказы. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Выкарыстайце словы: *у бальніцы, у полі, у школе, на ферме.*



**Пагутарым.** Якія яшчэ прафесіі вы ведаеце? Дзе працуюць вашы бацькі? Кім бы вы хацелі быць?



**5.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы. Устаўце патрэбныя прыназоўнікі.

Летняя ноч апускаецца ... зямлю заціхаюць птушкі край неба блішчыць шырокаю чырвонаю стужкай лёгкія хмаркі афарбаваліся ... залаты колер ... лугам уздымаецца туман ... небе ўзышла яркая вячэрняя зорка (*паводле Я. Коласа*).

Запішыце тэкст. У першых двух сказах падкрэсліце галоўныя члены.



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце. Назавіце прыстаўкі і прыназоўнікі, параўнайце іх.

Турысты дабраліся да горада. Параход адплыў ад берага. Міхась з'ехаў з гары.

Спішыце. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

**2.** Прачытайце. Адкажыце на пытанні. Спішыце тэкст. Абазначце прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі.

Хлопчык убачыў, як плача дзяўчынка. Падбег да яе і запытаўся, што здарылася, чаму яна плача. Пашкадаваў яе, узяў за ручку і павёў да мамы.

? Чаму хлопчык падбег да дзяўчынкі?
Як дапамог хлопчык дзяўчынцы?
Які хлопчык (*злосны, нягодны, кепскі, сардэчны, добры, уважлівы*)?
Ці хацелі б вы сябраваць з такім хлопчыкам? Чаму?

**3.** Прачытайце. Спішыце, раскрываючы дужкі.

Настаўнік аб'явіў вучням (*аб*) экскурсіі. (*Да*) школы (*пры*) ехаў аўтобус. Вучні (*па*) ехалі (*у*) Нацыянальную бібліятэку.

Абазначце прыстаўкі і падкрэсліце прыназоўнікі.



Правообладатель Народная асвета

**4.** Прачытайце тэкст. Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце прыстаўкі і прыназоўнікі.

### Экскурсія

(*За*) рэчкай пачынаўся лес. Разам (*з*) настаўніцай вучні пайшлі (*на*) экскурсію.

(*У*) лесе (*пад*) ялінай яны (*у*) бачылі партызанскую зямлянку. (*Над*) зямлянкай (*з*) вісалі галіны дрэў. (*Пад*) сасной дзеці знайшлі гільзу (*ад*) снарада, а (*пад*) бярозай — салдацкую каску. Усё гэта вучні (*пры*) неслі (*у*) школу і (*з*) далі (*у*) школьны музей.



**5.** Прачытайце. Устаўце прыстаўкі.

..слаць па ваду, ..ехаць да школы, ..плаціць за праезд

Складзіце з дадзенымі словазлучэннямі сказы і запішыце. Абазначце прыстаўкі і прыназоўнікі.

## 52

**1.** Прачытайце сказы. Замест кропак устаўце патрэбныя прыназоўнікі. Запішыце.

Звяры і птушкі жывуць ... (*лес*). Рыбы плаваюць ... (*мора*). Агародніна расце ... (*агарод*). Яблыкі і грушы спеюць ... (*сад*).

**2.** Прачытайце сказы.

Мама (*з*) варыла абед (*на*) пліце.

(*У*) газеце я (*пра*) чытаў (*аб*) навінах (*у*) свеце.



Правообладатель Народная асвета

(*На*) балоце мы (*на*) бралі поўныя кошыкі журавін.

Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс прыставак і прыназоўнікаў.

**3.** Прачытайце тэкст. Замест кропак устаўце патрэбныя прыназоўнікі. Прыдумайце загаловак. Запішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Увесь тыдзень я чакаў нядзелю. Мы … татам збіраліся … раніцы пайсці … заапарк. Мы паехалі … аўтобусе. … заапарку мы ўбачылі шмат звяроў і птушак. Мне вельмі спадабалася … заапарку. … панядзелак я … школе раскажу сябрам … наш паход.



**4.** Разгледзьце малюнак. Складзіце па ім сказы. Запішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**5.** Прачытайце. Шкодныя парады ператварыце ў карысныя. Запішыце карысныя парады. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Крычы (*на*) уроку —
Рабі (*у*) сшытках памылкі —
Малюй (*на*) сценах —
Пішы (*на*) старонках кніжак —
Раскідвай смецце (*па*) падлозе —



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце сказы. Спішыце. Раскрыйце дужкі. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Пчала ляціць (*за*) мёдам. (*У*) блакітным небе звініць жаваранак. Зайчаня схавалася (*пад*) куст. Навальніца наляцела (*на*) лес. (*Па*) лесе ідзе гул.

**2.** Прачытайце.

(*па*) скакаў (па) дарозе, (*да*) ехалі (*да*) вёскі, (*з*) ляпіў (*з*) гліны, (*вы*) йшлі (*з-за*) дому, (*з*) лезлі (*з*) гары, (*ад*) ышлі (*ад*) берага

- Спішыце, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце прыназоўнікі, абазначце прыстаўкі.
- Выберыце 2 словазлучэнні, складзіце з імі сказы і запішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі і абазначце прыстаўкі.
- Складзіце словазлучэнні з дадзеных слоў. Выкарыстайце прыназоўнікі і прыстаўкі. Запішыце па ўзоры. Змяняйце канчаткі, дзе трэба.

Узор: ***пачуў па радыё.***

| | |
|---|---|
| ляцеў (...) неба | чуў (...) радыё |
| бачыў (...) тэлевізар | ішоў (...) грыбы |
| ехаў (...) горад | плыў (...) возера |

**3.** Прачытайце загадкі *М. Пазнякова*.



1) Выpабляюць нас з паперы,
Упрыгожваем кватэры.



Правообладатель Народная асвета



2) Што за коннік у сядле —
Ногі за вушамі?
Не пытайцеся ў мяне,
Адгадайце самі.

Спішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**4.** Прачытайце. Запішыце тэкст пад дыктоўку.

## Лес

З даўніх часоў лес служыць чалавеку. З дрэва можна пабудаваць хату, зрабіць мэблю, вырабіць паперу.

А як прыгожа ў лесе вясною! Зазелянеюць дрэвы, запахне хвоя. Прыляцяць з выраю птушкі. Прабяжыць па верхавінах дрэў цёплы ветрык. Прыслухайся і пачуеш адвечную песню лесу.

Падкрэсліце прыназоўнікі, абазначце прыстаўкі.

**5.** Прачытайце. Спішыце. Устаўце замест кропак прыназоўнікі, якія падыходзяць па сэнсе: *у, каля, з, да, над, пад, ад.*

Рака працякае ... вёскі. Дзеці спяшаліся ... рақі. Добра ... лесе летам. Плывуць хмары нізка ... зямлёй. Маладая траўка прабіваецца ... зямлі.

## *Што мы ведаем?*

**1.** Якія словы мы называем прыназоўнікамі?
**2.** Як пішуцца прыназоўнікі са словамі?



Правообладатель Народная асвета

# СКАЗ

## Паняцце пра сказ

**1.** Прачытайце словы групамі. Ці кожную групу слоў можна аб'яднаць у сказ?

мяч, ракета, кніга
вуліца, акуляры, сумка
кветка, матылёк, лятае
возера, рыба, плавае

Запішыце сказы, якія ў вас атрымаліся. Якая думка перадаецца ў кожным сказе?

**2.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце асобныя прадметы, якія намаляваны злева. З гэтымі назвамі складзіце сказы, якія можна напісаць пад малюнкамі справа.










Правообладатель Народная асвета

Запішыце сказы. Якая думка перадаецца ў кожным сказе?

**Сказ** — гэта слова або некалькі слоў, якія звязаны паміж сабой па сэнсе і перадаюць закончаную думку.

**3.** Прачытайце верш.

Прыляцелі з поўдня спеўныя шпакі.
Зазвінелі ў небе жаўранкаў званкі.
На паляне ціхай
у густым бары
ажылі пралескі —
весніх дзён сябры. *П. Прануза.*

Выпішыце сказы, у якіх перадаецца думка пра шпакоў, пра жаўранкаў і пра пралескі.

**4.** Перадайце ў сказах думку пра сябе і пра свайго таварыша. Запішыце сказы.

Выкарыстайце словы: *я, вучыцца, у, трэцім, клас, мой, сябар, цікавіцца, розныя, насякомыя.*



**5.** Прачытайце і запішыце прыказкі. Якая думка перадаецца ў кожнай з іх?

*Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей.*
*У разумнага чалавека разумныя і рукі.*



Правообладатель Народная асвета

**1.** Прачытайце сказ і пытанні да яго. Што змянілася ў сказах? Адкажыце на пытанні пісьмова.

Міколка паехаў да бабулі.
Хто паехаў да бабулі?
Куды паехаў Міколка?

**2.** Прачытайце сказы. Пастаўце да іх пытанні і запішыце.

Касманаўт ляціць у космас. Папугай сядзіць у клетцы. Вецер калыша галінкі дрэў.

**3.** Прачытайце. Дапоўніце сказы словамі па пытаннях. Запішыце сказы.

(Куды?) у ... ляціць (які?) ... карабель.
З поўдня (што робіць?) ... цёплы (што?) ... .

Выкарыстайце словы: *космас, касмічны, дзьме, ветрык*.

Якая думка выказваецца ў кожным сказе?

Словы ў сказе звязаны паміж сабой па сэнсе і па пытаннях: *дзень* (які?) *цёплы, ветрык* (што робіць?) *дзьме*.

**4.** Ад слова ***ехаць*** пастаўце пытанні да слоў *у горад, па дарозе, раніцай, з сябрамі, хутка, з дому*.

Узор: *ехаць* (куды?) *у горад*.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце. Складзіце і запішыце сказы. Вусна пастаўце пытанні да кожнага слова.

| | | |
|---|---|---|
| зялёная | | на паляне |
| высокая | елка расце | у гушчары |
| старая | | каля дарогі |

## 56

# Сказы апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя

**1.** Прачытайце. Чым адрозніваюцца сказы? Запішыце сказы.

Дзецям падабаюцца кнігі.
Дзеці, вам падабаюцца кнігі?
Цікаўцеся кнігамі!

**2.** Прачытайце. З якой інтанацыяй трэба чытаць гэтыя сказы?

— Давай пазнаёмімся.
— Мяне завуць Юра. А цябе як завуць?
— А мяне завуць Алёша.
— Дзе ты жывеш, Алёша?
— Я жыву ў Тураве.

Разыграйце сцэнку знаёмства са сваім сябрам.

**Ту́раў Ла́твія Літва́ По́льшча Расі́я Украі́на**

**3.** Прачытайце. Якая думка перадаецца ў кожным сказе? Запішыце сказы.



Правообладатель Народная асвета

Мы чыталі апавяданні пра розныя краіны. Ты наведваў іншыя краіны? Як хочацца ўбачыць розныя краіны!

З якімі краінамі мяжуе Беларусь?

Сказы бываюць **апавядальныя, пытальныя** і **пабуджальныя.**

**У апавядальным** сказе пра што-небудзь паведамляецца. У канцы апавядальнага сказа ставіцца кропка. *Скончыўся навучальны год.*

**У пытальным** сказе заключаецца пытанне. У канцы пытальнага сказа ставіцца пытальнік. *Ты выканаў заданне?*

**У пабуджальным** сказе выражаецца пабуджэнне да дзеяння, прапанова, выказваецца пажаданне, просьба або загад выканаць дзеянне. *Слухайце ўважліва!*

**4.** Прачытайце сказы. Якія знакі прыпынку трэба паставіць у канцы кожнага сказа? Запішыце сказы. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

Вучні спяваюць вясёлую песню
Хто спявае вясёлую песню
Заспяваем дружна песню

**5.** Прачытайце верш. У якіх сказах заключаецца пытанне? Выпішыце пытальныя сказы. Пастаўце знакі прыпынку.



Правообладатель Народная асвета

Задаюць пытанні дзеці — ім цікава ўсё на свеце:

— Чаму сонейка пячэ

— Адкуль ручаёк цячэ

— Куды воблачка плыве

— Дзе зімою рак жыве

Кажа дзецям дзед Мікола:

— Вам пра ўсё раскажа школа. *М. Валько.*

---

57

**1.** Прачытайце выразна верш. У якіх сказах заключаецца паведамленне? Выпішыце апавядальныя сказы.

— А чаму ты чорны, кот?
— Лазіў ноччу ў дымаход.
— А чаму ты пабялеў?
— З гладыша смятану еў.
— А чаму ты шэрым стаў?
— У пяску Барбос качаў.
— Дык які ты колер маеш?
— Сам скажы. Чаго пытаеш? *У. Бабкоў.*

**2.** Прачытайце. У якіх сказах заключаецца пытанне?

— Што, сябры, для жыта трэба?
— Ну, вядома, трэба глеба.
— А для птушкі?
— Вышыня.
— А для казкі?
— Цішыня.



Правообладатель Народная асвета

— Ну, а што для весялосці?
— Каб часцей бывалі госці. *М. Гелер.*

Выпішыце пытальныя сказы.

 **3.** Прачытайце дыялог. Прадоўжыце яго.

— Прывітанне
— Добры дзень
— Куды ты ідзеш
— Я іду да сябра
— Што вы будзеце рабіць
— Мы будзем майстраваць шпакоўню
— Хто вам будзе дапамагаць
— ...
— ...

Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.

**4.** Прачытайце. Змяніце апавядальныя сказы на пабуджальныя.

Узор. *Ты ідзеш дадому. Ідзі дадому!*

Ты рашаеш задачу. Ты прыбіраеш пакой. Вы робіце ўрокі. Вы дапамагаеце сябрам.

- Запішыце сказы па ўзоры.
- Змяніце апавядальныя сказы на пытальныя. Запішыце.
- Прыдумайце апавядальны сказ. Змяніце яго на пытальны і пабуджальны. Запішыце.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце сказы. Вызначце, якія з іх апавядальныя, якія — пытальныя, якія — пабуджальныя.

Першымі ў беларускіх лясах зацвітаюць сон-трава, ветраніца і пралеска Але чаму яны занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі Зберажом першыя веснавыя кветкі ў беларускіх лясах

Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў.

58

## Клічныя сказы

**1.** Прачытайце верш-загадку. Адгадайце.

Вас цікавіць навіна?
Вось яна!
Вы чакалі казку?
Калі ласка!
Трэба вам кіно? Вось яно!
Усё раскажа і пакажа, —
мы сябруем з ім даўно. *В. Жуковіч.*

**тэлеві́зар** **ве́траніца** **Чырво́ная кні́га**

Выпішыце сказы, якія перадаюць пачуццё захаплення. Які знак прыпынку ў іх трэба паставіць?

**2.** Прачытайце выразна верш. Што выражаецца ў клічным сказе? Спішыце.



Правообладатель Народная асвета

Жаўручок мой, жаўручок,
сябар мой вясёлы!
Дзе ж ён, дзе ж ён, твой куток,
тут, у полі голым? *Л. Мароз.*

Сказы, у якіх перадаецца прывітанне, заклік або моцнае пачуццё (радасць, здзіўленне, захапленне, гнеў), называюцца **клічнымі:** *Няхай квітнее наша Радзіма!*

У канцы клічнага сказа ставіцца клічнік **(!)**.

**3.** Прачытайце. Назавіце клічныя сказы. Што ў іх перадаецца? Выпішыце клічныя сказы.

Дзень выдаўся халодны, пахмурны. Усё сцішылася, змоўкла. Але чыя гэта песня звініць?

Звонка спявае жаўручок. Падымаецца пад самыя хмары. Нечакана з-за хмары выглянула яркае сонейка.

Лёнька радасна крыкнуў бацьку: — Татка! Жаўручок хмары разагнаў! Бачыш, сонейка паказалася! (*Паводле М. Янчанкі*).

**4.** Прачытайце тэкст. Назавіце клічныя сказы. Выпішыце іх.

Сонца абсушыла зямлю. У лесе шуміць свята мурашак. Як жа ім не святкаваць! Першы раз пасля зімы пакінулі яны цёмнае падзямелле. Выйшлі на святло, да сонца!



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце. Што выражаецца ў кожным сказе? Спішыце. Пастаўце знакі прыпынку.

**Сарока і мыш**



— Мышка, ты трэску баішся
— Ані не баюся
— А моцнага тупату
— Ні кроплі не баюся
— А страшнага рыку
— Ніколечкі не баюся
— А чаго ж ты тады баішся
— Ды ціхага шораху. *М. Сладкоў.*

59

## Галоўныя і даданыя члены сказа. Дзейнік і выказнік

**1.** Прачытайце сказы. Пастаўце пытанні да кожнага слова.

Вясна настае, сняжок растае,
дзень прыбывае, луг ажывае.

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія адказваюць на пытанні што? — прамой лініяй, а словы, якія адказваюць на пытанні што робіць?, — дзвюма прамымі лініямі.

**2.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе. Спішыце. Падкрэсліце іх прамой лініяй.



Правообладатель Народная асвета

Снег пачарнеў. На ўзгорках з'явіліся праталіны. З палёў бягуць ручаі. Вада залівае нізкі бераг. Трашчыць лёд на рацэ. Начны мароз слабее.

Слова, якое абазначае, пра каго ці пра што гаворыцца ў сказе, называецца **дзейнікам.** Дзейнік адказвае на пытанні хто? або што?: *З палёў бягуць* ***ручаі.***

**3.** Прачытайце і запомніце верш. Запішыце яго па памяці. Падкрэсліце дзейнік.

Ручайкі звіняць, гамоняць,
снег зганяюць да ракі.
А высока ў небе звоняць
срэбным звонам жаўрукі. *А. Дзеружынскі.*

**4.** Прачытайце. Устаўце адпаведныя словы. Запішыце. Падкрэсліце дзейнікі прамой лініяй.

Узышло … . Павеяў лёгкі … . Усе … закалыхалі сваімі галінкамі. Заспявалі … .

Выкарыстайце словы: *птушкі, дрэвы, ветрык, сонейка.*

**5.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце дзейнік.

Скончылася зіма. Сонейка прыгрэла зямлю. На дрэвах набухаюць пупышкі. Заўзята ціўкаюць вераб'і. Бягуць імклівыя ручайкі. Дзеці чакаюць прылёту птушак.



Правообладатель Народная асвета

**1.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце словы. Складзіце сказы. **60**



хто? кот, мыш, ліса, заяц

што робіць? ловіць, даганяе, уцякае, схаваўся

што? норка, дрэва

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія адказваюць на пытанне хто?, — прамой лініяй, а сло-



Правообладатель Народная асвета

вы, якія адказваюць на пытанне што робіць?, — дзвюма прамымі лініямі.

**2.** Прачытайце сказ. Што ў ім пераблытана? Вызначце дзейнік.

На дарозе бартавой па машыне роўнай з дому вёз дзівак зімой у дуброву дровы (*В. Жуковіч*).

Запішыце сказ правільна. Падкрэсліце слова, якое абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, дзвюма прамымі лініямі.

Слова, якое абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, называецца **выказнікам.** Выказнік адказвае на пытанні што робіць? што робяць?: *Вада* ***залівае*** *нізкі бераг.*

**3.** Прачытайце. Дапоўніце сказы выказнікамі.Запішыце. Падкрэсліце выказнік.

Птушкі ... гнёзды вясною. Буслы ... гняздо на старой ліпе. Лес вясною ... ў зелень. ... зялёныя лясы.

Выкарыстайце словы: *пабудавалі, уюць, апрануўся, шумяць.*

**4.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце выказнік.

*Сакавік часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе. Сакавік дрэвам сок пускае. Сакавік дажджом імжыцца — хлеба будзе ў рукавіцу.*



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце загаловак.

Нечакана прыляцелі буслы. А жылі яны на старым клёне. Буслы кожны год прылятаюць у сваё гняздо. Ніхто не крыўдзіць тут буслоў.

Спішыце. Падкрэсліце дзейнік і выказнік.

---

## 61

**1.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

*Розум і сілу перамагае. На навуцы свет стаіць. Навука вочы адкрывае.*

Спішыце. Падкрэсліце дзейнік і выказнік.

Дзейнік і выказнік утвараюць сказ. Яны выражаюць асноўную думку сказа. Такі сказ называецца **простым**.

**Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа.**

**2.** Прачытайце загадку. Адгадайце яе. Спішыце. Падкрэсліце дзейнік і выказнік у кожным сказе.

На палеткі, на луг
разаслаўся кажух.
А прыйшоў сакавік,
ён заплакаў і знік.

**Пагутарым.** Чаму першы месяц вясны названы сакавіком?



Правообладатель Народная асвета

**3.** Разгледзьце малюнкі. Запішыце адказы на пытанні. Падкрэсліце дзейнік і выказнік.





Каго дзеці сустракаюць вясной з выраю?
Для каго дзеці пабудавалі шпакоўні?
Хто жыве ў шпакоўнях?

**4.** Прачытайце верш. Вывучыце на памяць. Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

Сакавік свой крок ступіў
і пратaліны зрабіў.
Вёрткі, жвавенькі шпачок
піў салодкі з клёна сок. *А. Дзеружынскі.*

**5.** Прачытайце. Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

Сярод маладой травы гараць жоўтыя агеньчыкі. Гэта расцвілі кветкі дзьмухаўцу. Дзьмухаў-



Правообладатель Народная асвета

цы з'яўляюцца ранняй вясной. Кружацца над кветкамі калматыя чмялі. П'юць салодкі сок руплівыя пчолкі.

62

**1.** Разгледзьце малюнак. Складзіце сказы. Прыдумайце загаловак. Запішыце тэкст.



Зіма, марозная, скончылася.
Стала, неба, і, празрыстым, блакітным.
Сонейка, ласкава, прыгрэла.
Ажываюць, і, кусты, дрэвы, зімовага сну, ад.
Зазелянела, на, траўка, пагорках.


Правообладатель Народная асвета

З’явіліся, пралескі, першыя кветачкі, веснавыя.

З, краёў, да, вярнуліся, сябры, крылатыя, далёкіх, нас.

**2.** Запішыце назвы вясновых месяцаў. Складзіце з імі сказы і запішыце.

**63**

**1.** Прачытайце тэкст.

Пазней за ўсіх вярнуліся з выраю ластаўкі і стрыжы. Восенню гэтыя птушкі адляцелі першымі, а вярнуліся апошнімі. Цяпер ластаўкі і стрыжы лепяць свае гнёзды пад стрэхамі дамоў (*паводле А. Вольскага*).

Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

Акрамя галоўных, у сказе могуць быць даданыя члены сказа. Яны паясняюць дзейнік і выказнік або іншыя даданыя члены сказа. *Руплівая пчолка збірае духмяны мёд.*

**2.** Прачытайце. Вызначце галоўныя члены сказа. Пастаўце пытанні ад галоўных членаў сказа да даданых.

У жаваранкаў існуе свой хор. Перад заходам сонца жаваранкі ўзлятаюць высока-высока ў неба. Адзін перад адным льюць жаваранкі свае



Правообладатель Народная асвета

пяшчотныя песні на зямлю. А як схаваецца сонца, змоўкнуць і песняры. Навокал наступае вячэрняя цішыня (*паводле І. Грамовіча*).

Спішыце. Падкрэсліце дадзеныя члены сказа хвалістай лініяй.

**3.** Разгледзьце малюнкі. Скажыце, ці бывае так. Складзіце правільныя сказы і запішыце. Падкрэсліце дадзеныя члены сказа.



**4.** Прачытайце верш. Адкажыце на пытанні.

На бярозе пад акном
я шпаку прыладзіў дом.
Толькі адысці паспеў —
шпак адразу прыляцеў.

Дом утульны аглядае,
песню весела спявае.



Правообладатель Народная асвета

У шпака ёсць у двары
вельмі добрыя сябры. *Т. Кляшторная.*

Дзе хлопчык прыладзіў дом для шпака?
Што зрабіў шпак?
Якія сябры ў шпака?

- Спішыце верш. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказаў.
- Запішыце адказы на пытанні. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказаў.
- Складзіце і запішыце 2 сказы пра шпака. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа.

**5.** Назавіце пералётных птушак. З назвамі складзіце 3-4 сказы і запішыце. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены сказа.

**64**

## Сувязь слоў у сказе. Словазлучэнне

**1.** Прачытайце. Як звязаны словы ў сказах? Вызначце сувязь слоў у сказах па пытаннях.

Доўгі дзень адплывае за аблокі (*Г. Бураўкін*).
Голуб кружыць у блакітным небе (*Я. Брыль*).

Выпішыце з кожнага сказа дзейнік з выказнікам, падкрэсліце іх. Вусна пастаўце пытанні ад галоўных членаў сказа да даданых.



Правообладатель Народная асвета

Словы ў сказе звязаны парамі па сэнсе. Сувязь слоў вызначаецца па пытаннях ад аднаго слова да другога.

**2.** Прачытайце сказы. Вызначце сувязь слоў у сказах па пытаннях.

З раніцы да вечара сыпле дробны дождж. Сасновы бор лёгка калыхаўся ад ветру.

Выпішыце са сказаў спачатку дзейнік з выказнікам і падкрэсліце іх. Потым выпішыце іншыя словы, звязаныя паміж сабой парамі па сэнсе. Пастаўце пытанні.

Узор: *Дождж сыпле. Дождж* (які?) *дробны, сыпле* (калі?) *з раніцы да вечара.*

Два словы, звязаныя паміж сабой па сэнсе, — гэта **словазлучэнне**. У словазлучэнні адно слова залежыць ад другога. Дзейнік разам з выказнікам словазлучэннем не з'яўляецца.

**3.** Прачытайце верш. Вызначце сувязь слоў у сказе па пытаннях.

У казках ігрушы растуць на вярбе.
Грамаце вучыць варона сароку.
У казцы знайшоўся адзін верабей.
Ён возера выпіў у спёку. *В. Вітка.*



Правообладатель Народная асвета

- Спішыце. У двух першых сказах падкрэсліце галоўныя члены.
- Выпішыце словазлучэнні з 1-га сказа. Пастаўце пытанні ад аднаго слова да другога.
- Выпішыце словазлучэнні з 2-га і 4-га сказаў. Пастаўце пытанні ад аднаго слова да другога.

**4.** Прачытайце сказы. Вызначце сувязь слоў у сказе па пытаннях. Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Выпішыце словазлучэнні.

Сонейка вясновае радасна ўсміхаецца (*У. Карызна*). Стаіць бярозка ля акна (*А. Вялюгін*).

**5.** Прачытайце верш. Вызначце сувязь слоў у сказе па пытаннях. Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Выпішыце словазлучэнні.

Паляцела дзяўчына  
самалётам гонкім  
над шчаслівай краінай,  
над роднай старонкай. *Янка Купала.*

## 65

**1.** Прачытайце пары слоў. Знайдзіце тыя пары, якія словазлучэннем не з'яўляюцца.

| | |
|---|---|
| першыя зоркі | выглянула сонейка |
| месяц падняўся | сонейка вясновае |
| падняўся над лесам | вясёлыя гукі |

Запішыце словазлучэнні. Пастаўце пытанні.



Правообладатель Народная асвета

**2.** Разгледзьце малюнак.



Прачытайце пачатак і канец апавядання. Дапішыце апавяданне. Прыдумайце загаловак.

Алёнка захварэла. Яна доўга не магла хадзіць у школу і вельмі сумавала. Аднойчы...

Хораша на душы ад сяброўскай увагі!

Выкарыстайце словы: *сяброўкі, дамашнія заданні, прыгожыя кветкі, растлумачылі, прыйшлі.*



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

*Сябры пазнаюцца ў бядзе.*
*Умей сябраваць, за сябра ў бядзе пастаяць.*

Запішыце прыказкі па памяці.

**66**

**1.** Прачытайце словазлучэнні. Складзіце сказ. Запішыце. Падкрэсліце дзейнік і выказнік.

Туман (які?) белаваты, апускаўся (як?) ціха, апускаўся (калі?) вечарам, апускаўся (куды?) на зямлю.

**2.** Прачытайце сказы.

Скончыўся дожджык. Выглянула сонейка. Зайграла вясёлка.

- Запішыце сказы. Падкрэсліце галоўныя члены.
- Дапоўніце сказы даданымі членамі і запішыце. Падкрэсліце даданыя члены.
- Дапоўніце сказы даданымі членамі. Выпішыце словазлучэнні. Пастаўце пытанні ад аднаго слова да другога.

**3.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх даданымі членамі. Запішыце новыя сказы. Падкрэсліце ў іх галоўныя члены. Выпішыце словазлучэнні.

Знікае хмарка. Блішчыць трава. Заззяла сонейка. Буркоча гром.



Правообладатель Народная асвета

**4.** Прачытайце словы. Складзіце з імі сказы. Запішыце. Падкрэсліце галоўныя члены. Выпішыце словазлучэнні.

З, краёў, вярнуліся, цёплых, на, пералётныя, радзіму, птушкі.

Луг, дыванам, яркіх, пярэстым, кветак, пакрыты.

**Пагутарым.** Каго мы называем сябрам? Ці добра мець сяброў, якія старэйшыя за цябе? Чаму?

Калі твой сябар параіць табе зрабіць нешта дрэннае, ці паслухаеш ты яго?

**5.** Прачытайце. Складзіце словазлучэнні.

| | |
|---|---|
| прабегчы (як?) | дадому |
| хадзіць (куды?) | лугам |
| адпачываць (калі?) | хутка |
| ехаць (адкуль?) | здалёк |

- Запішыце словазлучэнні.
- Запішыце сказы са словазлучэннямі.
- Запішыце сказы са словазлучэннямі. Вызначце сувязь слоў у сказах па пытаннях.

## 67

**1.** Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

*Добрая справа сама сябе хваліць. Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не*



Правообладатель Народная асвета

*гаснуць. Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе.*

Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа і назавіце дадзеныя.

**2.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы.

### Вясна

Наступіла вясна траўка зазелянела спачатку толькі на пагорках пазней зазелянела азімае жыта нарэшце зазелянелі лугі зазелянелі дрэвы і кусты заспявалі птушкі дружна ўзяліся за працу мурашкі і пчолы.

Запішыце сказы. Падкрэсліце галоўныя члены.

**3.** Складзіце са слоў сказы. Запішыце. Выпішыце словазлучэнні з першага сказа.

мёд, нам, даюць, пчолы
чалавек, для, будуе, іх, вулей
насякомыя, гэтыя, сваё, абараняюць, жыллё
кусацца, яны, балюча, могуць
і, працавітыя, вельмі, пчолы, карысныя

**4.** Прачытайце тэкст.

### Першая пралеска

Прыгрэла сонейка. На ўскрайку лесу расцвіла пралеска. Стаіць яна сярод лапін снегу. Не



Правообладатель Народная асвета

кветка, а маленькая кропелька блакітнага неба. Вакол яе шмат іншых блакітных кропель.

- Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа ў 1-м, 2-м і 3-м сказах.
- Выпішыце словазлучэнні з 2-га і 3-га сказаў. Пастаўце пытанні.
- Складзіце і запішыце 2-3 новыя сказы пра пралеску. Падкрэсліце ў іх галоўныя члены.

**5.** Прачытайце. Выпраўце памылкі. Запішыце сказы правільна. Падкрэсліце галоўныя і даданыя члены.

Дзеці налавілі ў рацэ шмат рачной рыбы.

Восенню часта ідуць халодныя восеньскія дажджы. У школе адбыліся цікавыя школьныя спаборніцтвы.

## 68 Простыя і складаныя сказы

**1.** Прачытайце тэксты. Параўнайце паміж сабой сказы ў іх. Чым адрозніваюцца сказы ў іх?

Наступіла добрае надвор'е. Пачалася веснавая сяўба.

Трактарысты апрацоўваюць глебу. Жанчыны рыхтуюць насенне бульбы.

Наступіла добрае надвор'е, і пачалася веснавая сяўба.

Трактарысты апрацоўваюць глебу, а жанчыны рыхтуюць насенне бульбы.



Правообладатель Народная асвета

Сказы могуць быць **простыя** і **складаныя.**

Складаныя сказы складаюцца з двух ці больш простых сказаў. Паміж імі на пісьме ставіцца коска. *Пайшлі цёплыя дажджы, і ўсё навокал зазелянела.*

**2.** Прачытайце тэкст. Назавіце простыя і складаныя сказы. Запішыце складаныя сказы. Растлумачце сэнс слова *рунь*. Падбярыце да яго блізкія па значэнні словы.

Яшчэ больш прыгрэла сонца, і рунь дружна пайшла ў рост. Паказаліся гонкія сцяблінкі, і вунь ужо птушка хаваецца ў жыце. А неўзабаве выплывуць даўгаватыя вусаценькія каласкі. Яны ўсё вышэй і вышэй пацягнуцца да сонца (*К. Камейша*).

**3.** Прачытайце. Назавіце простыя і складаныя сказы. Спішыце складаныя сказы.

На ствалах бяроз трапечуцца тоненькія стужачкі. Павее ветрык мацней, і адрываюцца стужкі ад бярозак. Так бярозкі мяняюць свае сукенкі, а ветрык ім дапамагае (*Ф. Рамашка*).



**4. Пагутарым.** Папрасіце маці купіць вам сукенку (*кашулю*). Апішыце яе колер, памер. Запішыце 2-3 складаныя сказы.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Прачытайце загадкі. Адгадайце іх. Назавіце простыя і складаныя сказы. Запішыце складаныя сказы.

1) Ішла паненка ўначы, згубіла ключы, месяц убачыў, а сонца падняло.

2) Дзень прыбывае, а ён худае.

3) Стаіць казёл над вадою, трасе барадою.

---

## 69

**1.** Прачытайце тэкст. Назавіце простыя і складаныя сказы. Спішыце складаныя сказы.

Птушкі спяваюць. Спевы — іх гутарка, размова. Людзі заўважылі, што маленькія птушкі спяваюць прыгажэй і мілагучней за вялікіх. Ніхто не ведае, пра што гавораць птушкі, спяваючы.

Спевы якой птушкі вам падабаюцца?

**2.** Прачытайце. З простых сказаў пабудуйце складаныя. Выкарыстайце словы **што, як**. Запішыце складаныя сказы, пастаўце коскі.

Дзеці пераканаліся. Расліны варушацца.

Яны бачылі. Раніцаю сланечнік павярнуў сваю вялікую кветку да сонца на ўсход.

**3.** Прачытайце. Прадоўжыце казку. Выкарыстайце складаныя сказы. Запішыце канец казкі.

Жыў-быў хлопчык, які меў шмат розных цацак. Але не бярог іх, ламаў, калечыў, і валяліся



Правообладатель Народная асвета

яны ўсюды. Уначы цацкі скардзіліся адна адной на свой лёс. Аднойчы...

**4.** Прачытайце. Спішыце складаныя сказы.

Прыйшоў вясёлы месяц май. І лес прыбраўся ў зелень. Усе кветкі цвітуць, а птушкі спяваюць. Сонца ўсіх абагрэла і ўсім светлую радасць дало (*В. Біянкі*).

### *Што мы ведаем?*

**1.** Што такое сказ?
**2.** Якія бываюць сказы?
**3.** Якія сказы называюцца апавядальнымі?
**4.** Якія сказы называюцца пытальнымі?
**5.** Якія сказы называюцца пабуджальнымі?
**6.** Як вымаўляюцца клічныя сказы?
**7.** Якія члены сказа называюцца галоўнымі? Якія — даданымі?
**8.** Якую пару слоў называюць словазлучэннем? Ці з'яўляецца словазлучэннем спалучэнне дзейніка і выказніка?
**9.** Як вызначаецца сувязь слоў у сказе?

**70**

## Тэкст

**1.** Прачытайце тэкст «**Арэшак**». Устаўце прапушчаныя літары.

Паспе. арэшак і .па. на зямлю. Так і бу..е ляжаць .сю зіму. Прой..е вясновы дож..ык, пры-



Правообладатель Народная асвета

грэе сонейка — і прарасце арэшак. Ён пусціць . зямлю карэньчык. Прой..е час. З маленькага расточка вырасце . лесе яшчэ а..ін арэхавы куст.

❓ Колькі тут сказаў? Ці звязаны яны па сэнсе? Ці ва ўсіх сказах гаворыцца пра арэшак? Ці ўдалы загаловак мае тэкст?

Некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе, называюцца **тэкстам**. У тэксце кожны наступны сказ развівае, працягвае думку папярэдніх.

**2.** Прачытайце. Ці з'яўляецца напісанае тэкстам?

На лясной палянцы расце вялізны дуб. Дзеці цэлы дзень упрыгожвалі пушыстую ёлку. Летам Алесь убачыў у кустах жураўля. У Белавежскай пушчы жывуць магутныя зубры.

Некалькі сказаў, у якіх няма агульнай думкі, тэкстам не з'яўляюцца.
Такія сказы не звязаны па сэнсе.

**3.** Прачытайце. Чаму гэты тэкст так цяжка чытаць? Вызначце межы сказаў. Расстаўце знакі прыпынку і запішыце тэкст правільна. Прыдумайце загаловак.

Дзядуля стаміўся і прысеў на лаўку побач скакаў і весяліўся Палкан дзядуля нахіліўся і



Правообладатель Народная асвета

пагладзіў сабаку па поўсці Палкан даверліва паклаў галаву на калені дзядулю і лізнуў яго рукі.

Першы сказ тэксту пачынайце пісаць з **чырвонага радка**. Кожны наступны сказ пішыце з вялікай літары, а ў канцы сказа стаўце патрэбны знак прыпынку.

**4.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы. Запішыце тэкст правільна. Прыдумайце загаловак.

У нашай школе ёсць жывы куток там жывуць чыжык, вожык і яшчарка у скрынках пасаджаны гарох, жыта і розныя кветкі расліны даглядаюць Жэня і Грыша жывёл даглядаюць Юра і Саша.

**5.** Складзіце апавяданне пра сваю дамашнюю жывёлу. Запішыце.

## 71

**1.** Прачытайце.

Хлеб — часцінка нашага жыцця. Нездарма кажуць у народзе: «Хлеб — усяму галава». Хлебам-соллю нашы бацькі пачыналі зажынкі, з хлебам-соллю выходзілі насустрач самым жаданым гасцям, хлебам-соллю ў час вяселляў сустракаюць маладых.

Нашы дзяды і бацькі, бабулі і матулі ўмелі шанаваць хлеб. У іх быў такі звычай, закон:



Правообладатель Народная асвета

калі кавалачак хлеба падаў са стала, яго патрэбна было падняць і перад тым, як з'есці, абавязкова пацалаваць (*М. Чарняўскі*).

Знайдзіце ў тэксце тое галоўнае, што аўтар хоча паведаміць чытачу. Што аўтар лічыць павучальным для чытача?

**Асноўная думка тэксту** — гэта галоўнае, што аўтар хоча сказаць чытачу.

**Тэма** — гэта тое, аб чым гаворыцца ў тэксце. Яна можа быць вызначана ў загалоўку або ў першым сказе тэксту.
**Загаловак** — гэта назва тэксту.

**2.** Прачытайце тэкст. Запішыце, устаўляючы прапушчаныя раздзяляльныя мяккі знак або апостраф. Падкрэсліце дзеясловы.

Усю ноч дождж барабаніў па шыбах. Раз.юшаны вецер няспынна выў. Нарэшце вецер сціх.
Дзям.ян Васіл.евіч выйшаў з пад.езда. Яго раз.ядалі сумныя думкі. Ужо тыдзень не працаваў пад.ёмны кран. А так хацелася хутчэй дабудаваць школу, у якой будзе вучыцца яго дачка Ул.яна.

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Прыдумайце загаловак.



Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытайце.

Родн.. слова — гэта першая кр.ніца, праз якую мы пазнаём жы..ё і акаляючы нас свет. Пагэтаму вам неабходна так старанна вывуча.ь сваю родную мову, веда.ь і любі.ь лепш творы б.ларускай літаратуры. І перш за ўсё трэба веда.ь свой наро., яго гісторыю, яго багатую вусную творчасць (*Я. Колас*).

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Прыдумайце загаловак.

Устаўце прапушчаныя літары. Запішыце.

**4.** Прачытайце. Размясціце сказы ў такой паслядоўнасці, каб атрымаўся звязны тэкст.

Што пакінуў мне бацька?

І сыны мае служаць.

Яна захоўваецца ў мяне, як святая рэліквія.

Наказ: берагчы Радзіму.

Утрох мы выконваем бацькоўскі наказ, служым той справе, за якую аддаў ён жыццё.

І яшчэ свой падарунак — чырвонаармейскую зорку.

Пад такой зоркай я служу ўжо больш як дваццаць гадоў (*В. Хомчанка*).

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Прыдумайце загаловак.

Запішыце тэкст.



Правообладатель Народная асвета

**5.** Складзіце сказы па пытаннях. Аб’яднайце сказы ў тэкст і запішыце.

Дзе жывуць розныя звяры і птушкі? Чыя хатка ў дупле? Дзе хаваецца зайчык? Хто жыве ў нары? А дзе спіць мядзведзь?

**72**

У тэксце сказы могуць звязвацца кветачкай або ланцужком. Калі з першым сказам звязаны ўсе астатнія, то атрымліваецца **кветачка.**




**1.** Уважліва разгледзьце малюнак. Карыстаючыся апорамі, апішыце ката.






Правообладатель Народная асвета

Прыдумайце загаловак. Апавяданне запішыце.

Пачынайце так:

Мой брат прынёс мне коціка. Назвалі яго ...

Калі другі сказ звязаны з першым, трэці — з другім і гэтак далей, то атрымліваецца **ланцужок.**




**2.** Прачытайце. Падзяліце тэкст на сказы. Запішыце. Як звязаны сказы — кветачкай ці ланцужком?

Каля хаты стаіць высокая бяроза лісточкі пажаўцелі яны павольна падаюць на зямлю вакол бярозы ўтварыўся залацісты дыван.

**3.** Разгледзьце малюнкі. Дайце імёны хлопчыкам. Да кожнага малюнка складзіце 1-2 сказы. Запішыце тэкст. Як звязаны сказы?







Правообладатель Народная асвета

Як вы ацэньваеце ўчынкі хлопцаў?
Чаму нельга разбураць мурашнікі? Навошта іх агароджваюць?

**4.** Разгледзьце малюнак і прачытайце пытанні да яго. Складзіце па пытаннях тэкст і запішыце.



Куды пайшлі рыбакі?
Хто злавіў карася?
Хто злавіў шчупака?
Каго злавіў Міша?

Як вы звязалі сказы — кветачкай ці ланцужком?



Правообладатель Народная асвета

**5.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце па іх сказы.





Вусна перакажыце, каб атрымаўся тэкст. Як вы звязалі сказы — ланцужком ці кветачкай?

**73**

**1.** Прачытайце тэкст *М. Янчанкі*.

Неяк восенню хлопчык пайшоў у лес. Убачыў там дзікую грушку і пашкадаваў яе. Яна была сукаватая ды калючая.

Хлопчык узяў ножык і абрэзаў ніжнія галіны і калючкі. Потым падправіў крону. Грушка стала стройнай і прыгожай. Вясной хлопчык зноў сустрэўся з дрэўцам. Убачыў і спужаўся. Дрэўца абгрызлі зайцы і казулі. Яно магло загінуць.

Пра гэта хлопчык расказаў бацьку. Ён параіў не спыняцца, пачаўшы добрую справу. Трэба перанесці дрэўца ў сад, замазаць раны. Пройдзе час, і грушка аддзякуе чалавеку.



Правообладатель Народная асвета

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Прыдумайце загаловак.

Вусна перакажыце тэкст з дапамогай пытанняў і словазлучэнняў.

? Што ўбачыў хлопчык неяк восенню ў лесе?
Чаму пашкадаваў дрэўца?
Як хлопчык дапамог грушцы стаць стройнай і прыгожай? Як выглядала дрэўца вясною?
Што параіў бацька?

Выкарыстайце словазлучэнні: *дзікую грушку, сукаватая ды калючая; узяў ножык, абрэзаў ніжнія галінкі і калючкі, падправіў крону; убачыў і спужаўся, абгрызлі зайцы і казулі, магло загінуць; не спыняцца, пачаўшы добрую справу, перанесці ў сад, замазаць раны; адзякуе чалавеку.*

## ? *Што мы ведаем?*

**1.** Што такое тэкст?

**2.** Ці з'яўляюцца тэкстам сказы, у якіх няма агульнай думкі?

**3.** Што такое тэма?

**4.** Што такое асноўная думка тэксту?

**5.** Што такое загаловак?

**6.** Як могуць звязвацца сказы ў тэксце?



Правообладатель Народная асвета

# СЛОЎНІК

## Дрэвы і кусты

агрэст
алешнік
арэшнік
асіна
бяроза
вярба
груша
дуб
елка
клён
лаза
маліна
парэчкі
рабіна
сасна
сліва
шыпшына
яблыня

## Кветкі

астры
васількі
ветраніца
вяргіні
дзьмухавец
званочкі
ландышы
півоні
пралескі
рамонкі
ружы
фіялкі

## Дом

абед
вячэра
гадзіннік
магнітафон
мэбля
пакой
посуд
снеданне
тэлевізар

## Мэбля

зэдлік
канапа
крэсла
ложак
паліца
стол
табурэтка
шафа

## Посуд

відэлец
кубак
лыжка
патэльня
талерка
шклянка

## Ягады і грыбы

баравік
брусніцы
журавіны
лісічкі
падасінавік
падбярозавік
суніцы
сыраежка
чарніцы



Правообладатель Народная асвета

# ЗМЕСТ

**Часціны мовы** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Назоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Напісанне назоўнікаў з вялікай літары . . 7
Род назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Лік назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Прыметнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Змяненне прыметнікаў па родах . . . . . . 30
Змяненне прыметнікаў па ліках . . . . . . . 39
Дзеяслоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Змяненне дзеясловаў па ліках . . . . . . . . 64
Змяненне дзеясловаў па часах . . . . . . . . 71
Правапіс **не** з дзеясловамі . . . . . . . . . . . 77
Прыназоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
**Сказ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Паняцце пра сказ. . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Сказы апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Клічныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Галоўныя і даданыя члены сказа. Дзейнік і выказнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Сувязь слоў у сказе. Словазлучэнне . . . . 114
Простыя і складаныя сказы . . . . . . . . . . 121
**Тэкст** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Слоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134



Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар школы)

| Вучэбны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Альфер** Маргарыта Віктараўна
**Сафонава** Ала Пятроўна

**Беларуская**
**мова**

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 2

2-е выданне, перапрацаванае

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *Т. У. Люковіч*. Мастакі *С. І. Ржавуцкая, А. Э. Жакевіч, В. Р. Мішчанка, Н. Л. Клімава, К. Э. Агуновіч, А. У. Філіпёнак*. Мастацкі рэдактар *А. А. Валатовіч*. Тэхнічны рэдактар *Г. А. Дудко*. Карэктары *Г. В. Алешка, В. С. Бабеня, Д. Р. Лосік, Т. М. Вядзернікава*.

Падпісана ў друк 22.03.2011. Фармат $70 \times 90^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 9,95. Ул.-выд. арк. 4,5. Тыраж 824 экз. Заказ 29.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.


Правообладатель Народная асвета